МУЖЧЫНЫ ПРА ДЗЯЦЕЙ І ЖАНЧЫН





ПАЛЯВАННЕ НА НАДМАГІЛЛІ 13


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 122 (29236)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«У цяперашніх умовах функцыянавання эканомікі пытанне захавання працоўных калектываў і забеспячэння выплаты заработнай платы — адно з найважнейшых пытанняў, якія знаходзяцца ў полі зроку ўрада па даручэнні Прэзідэнта. Каб не дапусціць разбалансіроўкі рынку, масавага вызвалення людзей ва ўмовах зніжэння вытворчасці, скарачэння аб'ёму паслуг з-за эпідэміялагічнай сітуацыі ў свеце, Прэзідэнт і ўрад прынялі неабходныя рашэнні. Створаны інструменты і вызначаны крыніцы падтрымкі прадпрыемстваў і бізнесу, якія істотна пацярпелі ад пандэміі COVID-19».*

# НА РОЎНАЙ ДАРОЗЕ



**Хутка будзе здадзена ў эксплуатацыю дарожная развязка, якая злучыць праезныя ўчасткі мінскіх вуліц Талстога і Маскоўскай. Над упарадкаваннем тратуараў і ўкладкай пліткі шчыруюць будаўнікі спецыялізаванага будаўнічага ўпраўлення № 3. На фота майстар Васіль ГЛЕБАЎ, які працуе на гэтым прадпрыемстве дзевяць гадоў, вызначае вышынныя меткі, каб плоскасць тратуарнай пліткі адпавядала праекту і была роўная і прыгожая.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Сярэдні заробак у маі склаў Br1227,9.**
- У Беларусі сярод моладзі налічваецца больш за 76 тысяч валанцёраў.
- **Урад зацвердзіў новую рэдакцыю візавых правіл Беларусі.**
- **У Брэсцкай крэпасці пачынаюць рэканструкцыю Пятага форта.**



- Трасу М1 / Е30 Брэст — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі плануецца рэканструяваць пад аўтамагістраль бесперабойнага руху.
- **Дзіцячая чыгунка 9 ліпеня адкрые 65-ы юбілейны сезон.**
- Легендарны спектакль «Не мой» вяртаецца на сцэну Купалаўскага тэатра.

Беражыце сябе!

## «Як у ваду кануў...»

### Каб купанне не стала апошнім



**Прадстаўнікі таварыства ратавання на водах назвалі вадаёмы, дзе ў купальны сезон людзі часцей за ўсё трапляюць у бяду. Лідзіруюць у гэтым спісе вадаёмы Віцебскай вобласці. Гэта не дзіўна: Віцебшчына — азёрны край. Там, напрыклад, знаходзіцца возера Доўгае, глыбіня якога больш за 53 метры. На асобым рахунку ў ратавальнікаў Нарач, Вілейскае вадасховішча — месца паломніцтва заядлых рыбакоў, Заслаўскае вадасховішча, яно ж Мінскае мора, і Салігорскае вадасховішча. Словам, глыбокія вадаёмы паблізу буйных гарадоў, куды летам кожныя выхадныя выязджаюць тысячы людзей...**

СТАР. 3

Тэма

## ДОМІК У ВЁСЦЫ

### Ці лёгка набыць нерухомасць або зямлю ў сельскай мясцовасці

**У Беларусі ў глыбінцы вельмі шмат пустуючых і старых дамоў. Магчыма, тысячы, дзясяткі тысяч. Гаспадары даўно памерлі, а дзеці не хочуць уступаць у спадчынныя правы. Гэтыя будынкі з цягам часу разбураюцца, прыходзяць у непрыгоднасць, а зямельныя ўчасткі зарастаюць быльнягом. Так і стаяць будыніны, як сведкі безгаспадарчасці. Нядаўна кіраўнік дзяржавы закрануў тэму набыцця зямельных участкаў ў сельскай мясцовасці з мэтай спрасціць продаж зямлі грамадзянам, якія хочуць набыць яе ў вёсках. «Танна аддадзім людзям, каб яны пабудавалі нейкі дом. І тым самым утрымаем неперспектыўныя вёскі і хутары», — сказаў Прэзідэнт.**



Мінчане Настасся і Сяргей Каляда пабраліся шлюбам гады тры таму. Маладая пара забяспечана гарадской кватэрай — бацькі пастараліся. Аднак летам сядзець у чатырох сценах не хочацца. Хочацца на прыроду, падыхаць свежым паветрам, схадзіць у лес, на рэчку. І вырашылі сужэнцы абзавесціся домікам у вёсцы. Купіць з аўкцыёну зямельны ўчастак непадалёк ад Мінска дорага, ды і крэдыт браць на будаўніцтва не рашыліся.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


**Завяршаецца падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе**

**Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай**

звязда — *Да чытача з любоўю!*

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# У ГОНАР ПЕРАМОГІ

## ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЎЧОРА ПРЫСУТНІЧАЎ У МАСКВЕ НА ВАЕННЫМ ПАРАДЗЕ, ПРЫСВЕЧАНЫМ 75-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ.


Фота БелТА.

**У ліку высокіх замежных гасцей, якія таксама прыбылі на парад, — прэзідэнты Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Сербіі, Таджыкістана, Узбекістана, прадстаўнікі вышэйшых органаў улады некаторых іншых дзяржаў, паслы краін — саюзнікаў СССР па антыгітлераўскай кааліцыі. Былі запрошаны таксама кіраўнікі некаторых міжнародных арганізацый, у тым ліку старшыня калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Міхаіл Мясніковіч і генеральны сакратар АДКБ Станіслаў Зась.**

Акрамя расійскіх ваенных у парадзе прынялі ўдзел прадстаўнікі 13 дзяржаў, у тым ліку па брусчатцы Краснай плошчы прамаршыравала група сцяганосцаў зводнай роты ганаровай варты Міністэрства абароны Беларусі ў складзе 60 чалавек.

Беларускія ваенныя пранеслі Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, баявыя сцягі партызанскага атрада імя Жалезняка, а таксама злучэнняў, якія прымалі ўдзел у вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сцягі гэтых жа злучэнняў былі пранесены па Краснай плошчы падчас гістарычнага парада Пераможцаў, які адбыўся 24 чэрвеня 1945 года ў гонар перамогі СССР над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне.

У Расіі парад з нагоды 75-годдзя Перамогі сёлета быў перанесены з 9 мая з-за пандэміі каранавіруса. Прэзідэнт РФ выбраў дату 24 чэрвеня, бо менавіта ў гэты дзень у 1945 годзе адбыўся гістарычны парад Пераможцаў. Па аналогіі цяперашняе ўрачыстасць была названа парадам Перамогі.

Пасля парада Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Маскве ўсклаў кветкі да Магілы Невядомага салдата каля Крамлёўскай сцяны. Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел Прэзідэнт Расіі — Уладзімір Пуцін і кіраўнікі іншых дзяржаў, якія прыбылі ў расійскую сталіцу на ўрачыстасці ў гонар 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Яны ўшанавалі мінутай маўчання памяць загінулых у гады вайны.

Магіла Невядомага салдата знаходзіцца ў Аляксандраўскім садзе каля сцен Крамля. Комплекс уключае надмагільную пліту, на якой устаноўлена бронзавая кампазіцыя — салдацкая каска і лаўровая галіна, якія ляжаць на сцягу. У цэнтры — ніша з надпісам «Імя тваё невядома, подзвіг твой бессмяротны» з бронзавай зоркай, у сярэдзіне якой гарыць Вечны агонь. Справа ад магілы размяшчаецца гранітная алея з блокамі, на якіх нанесены назвы гарадоў-героеў, уключаючы Мінск, а таксама Брэсцкай крэпасці, і выява медаля «Залатая Зорка». У блоках закладзены капсулы з зямлёй гарадоў-героеў.

Нагадаем, у Беларусі ваенны парад у азнаменаванне 75-й гадавіны Вялікай Перамогі правялі 9 мая. У ім удзельнічала каля 3 тысяч ваеннаслужачых і звыш 150 адзінак тэхнікі, у небе над Мінскам праляцелі 36 самалётаў і верталётаў. «Гэта свята для нас свяшчэннае. Трагедыя беларускага народа, які вынес на плячах тытанічны груз страт і разбурэнняў самай бязлітаснай вайны XX стагоддзя, непараўнальная ні з якімі цяжкасцямі сённяшняга дня», — падкрэсліў на ваенным парадзе ў Мінску Прэзідэнт Беларусі.

Напярэдадні візіту ў Маскву кіраўнік беларускай дзяржавы прыняў удзел у серыі памятных мерапрыемстваў. 20 чэрвеня Аляксандр Лукашэнка адкрыў мемарыяльны комплекс памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці, які размешчаны ў вёсцы Боркі Кіраўскага раёна. На наступны дзень Прэзідэнт наведаў Светлагорскі раён, дзе адбылася цырымонія адкрыцця мемарыяльнага комплексу «Ала» на месцы спаленай у гады вайны нацыстамі вёскі. У дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны, 22 чэрвеня, кіраўнік дзяржавы зрабіў паездку ў Брэст. Аляксандр Лукашэнка наведаў Брэсцкую крэпасць, дзе па традыцыі прайшло памятнае мерапрыемства.

**Паводле БелТА.**

Трыбуна дэпутата

## «СТРАЦІЦЬ СТАБІЛЬНАСЦЬ — ВЕЛЬМІ НЕБЯСПЕЧНА»



**Аб спробах пазбавіць беларусаў бяспекі і міру разважае намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Ігар ЛАЎРЫНЕНКА:**

— Як чалавек ваенны, як генерал і як ваеннаслужачы, які прымаў удзел у баявых дзеяннях на тэрыторыі Афганістана, хачу сказаць, што найбольшая каштоўнасць — гэта чалавечае жыццё. Адпаведна, найбольш важная задача дзяржавы — гэта гарантаваць бяспеку знешнюю і ўнутраную. І вельмі важна не дапусціць нейкіх пагроз унутры краіны. Наша дзяржава з гэтым спраўляецца — як на знешніх рубяжах, так і ва ўнутранай палітыцы.

Я доўгі час працаваў не ў Беларусі, у тым ліку ў Расіі, бываў у многіх краінах у службовых камандзіроўках. Беларусь заўсёды пазіцыянавалася як бяспечная дзяржава, дзяржава, у якой з задавальненнем прымалі турыстаў з усяго свету, дзе дзеці, жанчыны могуць гуляць у любы час сутак і не баяцца за сваё жыццё. Дзяцей неабавязкова пастаянна суправаджаць па горадзе — яны самі могуць перамяшчацца, таму што органы аховы правапарадку выконваюць сваю функцыю.

Страціць гэту стабільнасць вельмі небяспечна.

**Запісала Варвара МАРОЗАВА.**

## «ДАНОСЬЦЕ СВАЮ ПАЗІЦЫЮ КУЛЬТУРНА І АРГУМЕНТАВАНА»



**Людміла КАНАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях:**

— Мая пазіцыя як дэпутата — усе працэсы, звязаныя з выбарамі, павінны дакладна рэгулявацца выбарчым заканадаўствам, што і адбываецца ў нашай краіне. Кожны чалавек, безумоўна, мае права на сваю думку, бо яна абапіраецца на пэўны жыццёвы вопыт. Але, на мой погляд, пазіцыя грамадзяніна ў першую чаргу павінна зыходзіць з аналізу рэчаіснасці: таго, што мы маем, таго шляху, які прайшла наша краіна. Сапраўды, у нашай гісторыі было рознае, але сёння мы жывём у мірнай, прыгожай краіне, якая развіваецца і мае багаж дасягненняў.

Таксама мне вельмі б хацелася, каб кожны выбаршчык выказваў сваю пазіцыю цывілізавана, інтэлігентна, у рамках заканадаўства, не апускаўся да абраз і ганебных дзеянняў на адрас тых, хто думае інакш. Мы беларусы — людзі талерантныя, у нашым менталітэце выказвацца карэктна, пісьменна, паважаючы чужую думку. Магчымасць вызначыць сваю пазіцыю была апошнім часам забяспечана пікетамі па зборы подпісаў. І я таксама прыняла ўдзел у зборы подпісаў, аддаўшы свой голас за прэтэндэнта ў кандыдаты. Мой заклік да беларусаў — даносьце сваю пазіцыю культурна і аргументавана.

**Запісала Марыя ДАДАЛКА.**

Блізкая ўлада

## За праблемай канкрэтнага чалавека трэба бачыць сітуацыю ў цэлым

Пра гэта заявіла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС падчас асабістага прыёму ў Пінску



**«Гэта вельмі важна — вырашыць праблему кожнага чалавека. Але калі мы бачым звароты і аналізуем іх у сукупнасці, то павінны рабіць высновы пра тое, якія ёсць недапрацоўкі ў сістэме ў цэлым, якія ёсць рэсурсы для таго, каб палепшыць сітуацыю. Наша работа, у тым ліку Адміністрацыі Прэзідэнта і ўсёй сістэмы дзяржаўных органаў, павінна быць нацэлена на перспектыўнае развіццё. Недастаткова прааналізаваць толькі канкрэтны зварот. Трэба прааналізаваць у цэлым усё, што адбываецца ў тым ці іншым кірунку, зрабіць адпаведныя высновы і, зыходзячы з гэтага, выбудаваць далейшую работу», — сказала Вольга Чупрыс.**

Папярэдне на прыём запісаліся 10 чалавек. Большасць пытанняў датычылася юрыдычнай тэматыкі — адносін у галіне права, дзейнасці праваахоўных органаў, судовай сістэмы. Гэта не стала нечаканасцю для Вольгі Чупрыс. За апошні час колькасць зваротаў у Адміністрацыю Прэзідэнта з Пінскага рэгіёна ў цэлым знізілася. Разам з тым павялічылася колькасць зваротаў па праваахоўнай сферы, рабоце судовых органаў, выкананні вынесеных судовых рашэнняў. «Гэта значыць напрошваецца выснова: калі ёсць такі зрэз, павялічваецца колькасць зваротаў па гэтых кірунках, адпаведна, трэба на тое рэагаваць. Вядома, мы не пакінем без увагі згаданыя пытанні», — адзначыла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Яна звярнула ўвагу на тое, што ў цэлым мяняецца характар пытанняў, з якімі людзі звяртаюцца на асабістыя прыёмы. Напрыклад, раней часцей за ўсё гаворка ішла аб праблемах у жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Цяпер колькасць такіх зваротаў значна зменшылася. «Што сведчыць аб тым, што сістэма пачала працаваць у гэтым кірунку. Значыць скаргі грамадзян далі штуршок да таго, каб былі паляпшэнні ў гэтай сферы. Мне здаецца, людзі пачынаюць давяраць таму, што мы робім. Бо яны ўбачылі: адзін раз вырашылі, другі, трэці, потым сістэмна папрацавалі, палепшылі кірунак», — падкрэсліла Вольга Чупрыс.

Падчас сваёй паездкі ў рэгіён яна таксама наведала Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе азнаёмілася з праектамі, над якімі працуе інжынірынгавы цэнтр ВНУ, сустрэлася з прафесарска-выкладчыцкім саставам.

**Паводле БелТА.**

Думкі ўголас

## Будзем прафесіяналамі,

### альбо Чаму некаторыя калегі спрабуюць у чужой бажніцы свечкі папраўляць

**Прыйсці працаваць у сродак масавай інфармацыі, але імкнуцца быць «вышэй» за яго — усё роўна што хірургу на першай аперацыі абразіцца выглядам крыві. Наша работа — інфармаваць. З нагоды жальбы некаторых журналістаў, якія, здаецца, стараюцца зрабіць з сябе вязняў сумлення і на гэтай хвалі павысіць уласны рэйтынг, успомнюся адзін выпадак.**

Была яшчэ бяспёрым карэспандэнтам, затое з юнацкім максімалізмам. Трэба было падрыхтаваць матэрыял пра падарунак гораду ад нямецкага пабрацімa. І горда заявіла я рэдактару: не пайду, маўляў, у мяне дзядуля з імі ваяваў. А рэдактар мне адказала: «Пойдзеце. І зробіце добры матэрыял. Прафесійна». І я пайшла. І зрабіла. Бо тут выбар просты, як у таго хірурга.

Чытач не мусіць ведаць, якой рэлігіі ты трымаешся, колькі ты сёння спаў і як ты асабіста ставішся да свінак на ферме. Чытач чакае інфармацыю. Урэшце, калі б з усіх тэлевізараў чутна была адна хлусня, — глядач зрабіў бы свой выбар, проста націснуўшы на кнопку, ці не так? Але я не пра палітыку. Зачапіла, як той казаў, менавіта пытанне прафесіяналізму.

Праўду кажучы, сёння самая ўразлівая катэгорыя насельніцтва ў свеце — гэта белы мужчына-атэіст з традыцыйнай арыентацыяй. Дык сёння ў Беларусі журналісты дзяржаўных СМІ (што само па сабе ўжо пачало гучаць як абраза) сталі гэтымі самымі беднымі белымі мужчынамі... І ніякіх табе льгот. У адрозненне, дарэчы, ад тых, хто не справіўся з гэтым цяжарам і звольніўся, — ім спачуваюць, з іх робяць герояў. Але давайце прызнаем: збегчы працей за ўсё.

Мы не «ловім хайпу», не робім укідаў, не пішам фэйкаў, абы назбіраць лайкаў. Мы проста працуем — і а чацвёртай раніцы, і а восьмай вечара, і на ферме, і на заводзе. У полі, як той казаў, а не дзесьці, часам нават за межамі краіны. І нікому нічога не даказваем. Насамрэч, і жадання няма. Проста крыўдна за калег, таму што бачу, у якіх умовах працуюць. З гонарам. «Рабі, што павінен, і няхай будзе, што будзе» — гэта пра сённяшніх карэспандэнтаў.

Так, у нас таксама ёсць уласная ацэнка сітуацыі. На тое мы і homo sapiens, каб разважаць і рабіць вывады. Але нельга прыйсці ў прафесію і патрабаваць сабе асобных умоў толькі таму, што табе нешта не падабаецца. Годна прызнаць, што не справіўся, і сысці. Але паліваць брудам тых, хто застаўся, — нізка.

Сёння ўжо відавочна, хто чаговарты.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# «Як у ваду кануў...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З пачатку года ў Беларусі патанула 136 чалавек, адзначыў **старшыня Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Анвар ІГАМБЕРДЫЕЎ.** З іх 48 чалавек былі ў стане алкагольнага ап'янення. Купальны сезон гэтым летам адкрыўся пазней, чым звычайна, але нават за гэты кароткі перыяд у вадзе загінула пяць непаўналетніх.

## Мора па калена

Калі прыводзіць статыстыку, з году ў год колькасць людзей, што тонуць у вадаёмах Беларусі, зніжаецца. Так, у 2019 годзе вада забрала жыцці 364 чалавек, з іх 24 непаўналетнія. У 2018 годзе патанула 374 чалавекі, у тым ліку 30 дзяцей. У 2010 годзе ў вадзе загінула 1313 чалавек, 82 з якіх былі ва ўзросце да 18 гадоў. А ў 1999 лічбы і зусім зашкальвалі — 1600 чалавек і 190 непаўналетніх. За 20 га-доў колькасць патанулых скарацілася ў 4,5 раза. Але ёсць адна лічба, якая застаецца нязменнай, падкрэсліў спецыяліст. Штогод ад 65 да 73 % людзей, для якіх уваход у ваду стаў фатальным, знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

Несур'ёзнае стаўленне да мер бяспекі, пераацэнка ўласных сіл, бесклапотнасць у адносінах да сваіх дзяцей — усё гэта следства нецвярозай «адвагі».

А яшчэ ў спякоту і пад уздзеяннем алкаголю ў вадзе чалавека проста можа падвесці здароўе.

— Гарачае надвор'е само па сабе — нагрузка на арганізм: абязводжанасць, сухасць слізістых. Алкаголь жа запускае біяхімічныя працэсы, якія таксама вядуць да абязводжанасці. У выніку — згушчэнне крыві, павышаная рызыка тромбаўтварэння, рост артэрыяльнага ціску і парушэнне сардэчнага рытму. І верагоднасць такіх грозных ускладненняў, як інсульт ці інфаркт, — кажа **загадчыца амбулаторнага наркалагічнага аддзялення № 2 Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Вікторыя КОТАВА.**

## Не радасць, а бяда

«Страшных гісторый» у зводках таварыства ратавання на водах заўжды дастаткова.

Нецвярозы тата пасадзіў маленькага сына на плечы і паспрабаваў пераплысці возера. На сярэдзіне вадаёма яго пакінулі сілы. На шчасце, ратавальнікі падаспелі своечасова і выратавалі і бацьку, і малога. Але адлік ішоў на хвіліны.



У Гомельскай вобласці бацька з трыма сынамі і яго сябар паехалі «мужчынскай кампаніяй» адпачыць на вадаём. Дзеці пайшлі купацца, выпадкова патрапілі на плынь, і іх стала адносіць ад берага. Мужчыны кінуліся на дапамогу, але самі былі не надта добрымі плыўцамі. Выратаваць прадстаўнікам АСВОДа ўдалося толькі аднаго з дзяцей і аднаго дарослага. Трое чалавек патанулі.

Вялікая сям'я выехала на Салігорскае вадасховішча. Дарослыя адпачывалі, а чатырохгадовага малога пасадзілі на матрац, што гайдаўся на хвалях каля берага. Калі бацькі пачулі плач малога, матрац ужо быў аднесены на 30 метраў у ваду. За ім адразу ж кінулася пятнаццацігадовая дзяўчынка. Яна ўмела плаваць, але задача была ёй не па сілах. Патанула і сама, і хлопчык.

Пад Брэстам маленькае дзіця было пакінута без нагляду. Малога бачылі многія, але нікому ў галаву не прыйшло задацца пытаннем, чаму ён без дарослых каля вады. Усе думалі, мама дзесьці побач. Потым дзіця знікла. Яго сталі шукаць і знайшлі... у вадзе. Вярнуць да жыцця хлопчыка ўжо не змаглі.

## У вір галавой

Яшчэ адзін боль ратавальнікаў у купальны сезон — аматары ныраць: з мастоў, з агароджы, проста з крутога берага. Па словах Анвара Ігамбердыева, больш за ўсіх любяць ныраць у Барысаве і на Гомельшчыне. Часта даводзіцца ратаваць нырцоў на сталічных Цнянцы і Чыжоўскім вадасховішчы.

— Гэта смяротна небяспечная гульня — падкрэслівае старшыня АСВОДа. — Часта пасля такіх трукаў людзі становяцца інвалідамі. Прычым гэта, як правіла, маладыя людзі і падлеткі.

У Хойніцкім раёне маці з чатырма дзецьмі адправілася купацца на возера. Адзін хлопчык нырнуў, выбраўся на бераг і паскардзіўся: аднімаюцца ногі. Цяпер ён у рэанімацыі з сур'ёзным пашкоджаннем пазваночніка.

На вадаёмах, дзе ёсць станцыі таварыства ратавання на водах, спецыялісты рэгулярна абследуюць дно. Але і гэта не поўная гарантыя бяспекі. Плынь можа прынесці дрэва, вада можа сысці. Ды і чалавечы фактар ніхто не адмяняў: напрыклад, хтосьці можа кінуць у ваду пустую бутэльку...

— Мяне часта пытаюць: на якіх вадаёмах Беларусі можна ныраць. Адказваю: у басейнах, дзе ёсць трэнер, які навучыць правільна ўваходзіць у ваду. Без гэтага ўмення атрымаць сур'ёзную траўму падчас скачкоў у ваду можна нават у басейне.

## Дапамажы сабе сам

Сёння ў нашай краіне дзейнічае 66 станцый і 138 пастоў АСВОДа. Беларускія ратавальнікі працуюць эфектыўна. З пачатку года яны выратавалі жыцці 63 чалавек, восем з якіх — дзеці і падлеткі.

Літаральна на днях у Гродзенскай вобласці танула васьмігадовая дзяўчынка. Яна адправілася на вадаём з бабуляй. Дзяўчынку ўдалося выратаваць дзякуючы прадстаўнікам таварыства ратавання на водах і медыцынскаму работніку, якая праводзіла рэанімацыйныя мерапрыемствы.

Але ратавальнікі ёсць далёка не на ўсіх вадаёмах Сінявокай, таму важна памятаць: тваё жыццё і жыццё тваіх дзяцей — гэта твая адказнасць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

### ШТО Ж РАЯЦЬ РАТАВАЛЬНІКІ, КАБ ВАДА НЕ СТАЛА СІНОНІМАМ СЛОВА «БЯДА»?

- Выбіраць для купання вадаёмы, дзе ёсць інфраструктура, станцыі таварыства ратавання на водах і медыцынскія работнікі.
- Купацца ў спецыяльна прыстасаваных для гэтага месцах. Пакаты бераг і паступовае нарастанне глыбіні асабліва важныя, калі вы з дзецьмі.
- Ні на хвіліну не выпускаць дзяцей з-пад увагі паблізу вады.
- Не плаваць у месцах, забароненых для купання. Самыя небяспечныя вадаёмы — мелавыя кар'еры і рэкі з хуткім цячэннем.
- Не ўваходзіць у ваду ў нецвярозым стане.
- Не грэбаваць мерамі бяспекі. Правільна зашпіленыя ратавальныя камізэлькі пры катанні на лодках, яхтах, катамаранах — абавязковыя. «Мне горача» — не аргумент.
- Не ныраць у ваду ні «ластаўкай», ні «салдацікам».
- Не адпускаць кампаніі падлеткаў на вадаёмы без дарослых.

## Ведай нашых!

# ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ КОНКУРСУ СПАСОВІЧА

**Больш за сотню работ даслалі сёлета на штогадовы конкурс імя У. Спасовіча, заснаваны Міністэрствам юстыцыі. За жаданую і прэстыжную сярод юрыдычнай суполкі ўзнагароду — бронзавую статуэтку, якая ўвасабляе сабой законнасць і літаратурны талент, — змагаліся адвакаты, юрысты, журналісты і творчыя калектывы.**

Дасланыя на суд журы работы ў Міністэрстве юстыцыі назвалі скарбніцай ідэй і ініцыятыў, бо гэта не толькі публікацыі, тэле- і радыёперадачы на прававую тэматыку, але і паўнавартасныя выданні і цэлыя творчыя праекты.

— Усё гэта спрыяе стварэнню прававой дзяржавы і фарміраванню прававой культуры грамадства, — падкрэсліў **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.** — А журналісты, якія працуюць у прававой тэме, транслююць людзям новаўвядзенні заканадаўства, даступнай мовай выкладаюць часам складаныя для ўспрымання нормы права.




Цікавасць да конкурсу і яго прэстыж з кожным годам узрастаюць, як і колькасць удзельнікаў і намінацый. Сёлета сярод 24 журналістаў краіны **спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» Ірына СІДАРОК** стала пераможцам у сваёй катэгорыі, атрымаўшы галоўны прыз конкурсу — статуэтку. Пачэсная ўзнагарода — сведчанне прызнання юрыдычнай суполкай інфармацыйнай карысці і практычнай дапамогі людзям дзякуючы пастаяннай рубрыцы «Прававая гасцёўня», якую на старонках «Звязды» вядзе Ірына.

Віншуем калегу і жадаем новых творчых поспехаў!

## Шануй сваё

# ВЯРТЛЯВАЯ ЧАРОТАЎКА НА МАНЕТАХ БЕЛАРУСІ

**Адна з самых рэдкіх птушак нашай краіны, якая 22 гады таму стала сімвалам грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», упрыгожыла памятныя манеты.**

Цяпер нумізматы і аматары дзікай прыроды могуць набыць сабе ці для падарунка памятную манету «Заказнік «Званец» з рэльефнай выявай гэтай птушкі, якая корміцца сваіх птушанят. Гэта ўжо сёмая манета з серыі «Заказнікі Беларусі». На рэверсе манеты выяўлена рэдкая архідэя — венерын чаравік. Яна, як і вяртлявая чаротаўка, — адметны від заказніка «Званец».

**Дырэктар АПБ Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ** паведамляе, што вяртлявая чаротаўка — від, якому пагражае глабальнае знікненне, а ў Беларусі гэтай птушкі гняздуецца больш за 40 % яго сусветнай папуляцыі. «Вялікае асаковае балота Званец на Брэстчыне — найважнейшае месца гнездавання гэтай чаротаўкі ў свеце. Тут на балотных выспах батанікі знайшлі і найвялікшыя зараснікі рэдкіх архідэй. Дзякуй беларускім банкірам, якія дапамагаюць прыродаахоўнікам расказваць пра выдатную беларускую прыроду. Гэта дапаможа яе захаваць», — лічыць кіраўнік арганізацыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Другая хваля пандэміі каранавіруса можа пачацца ў Паўднёвым паўшар'і



Эпідэміёлагі асцерагаюцца, што з-за зімы, якая настала ў Паўднёвым паўшар'і, і сезона распаўсюджвання рэспіраторных захворванняў, да якіх адносіцца і COVID-19, можа пачацца другая хваля пандэміі, паведамляе Euronews. У аўстралійскім штаце Вікторыя ў апошнія дні назіраецца рост колькасці тых, хто заразіўся COVID-19. Прэм'ер-міністр штата Дэніэл Эндрус заклікаў да асцярожнасці і захавання санітарных мер. «Я разумею жаданне пакінуць усё ў мінулым, але, на жаль, рэальнасць іншая, і прыкідвацца і рабіць выгляд, што эпідэмія завяршана, сэнсу не мае», — адзначыў ён. Улады Аўстраліі і Новай Зеландыі заклікаюць жыхароў пры выяўленні найменшых сімптомаў прастуды неадкладна звяртацца па медыцынскую дапамогу, а таксама здаваць тэсты на каранавірус. Не спыняецца рост колькасці заражэнняў у Бразіліі. СААЗ расцэньвае эпідэміялагічную сітуацыю ў гэтай амерыканскай дзяржаве як адну з самых цяжкіх у свеце.

## ПАР абвясціла пра інвестыцыйны план на $133 млрд



Урад Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі апублікаваў дзесяцігадовы план інвестыцый у інфраструктуру аб'ёмам 2,3 трыльёна паўднёваафрыканскіх рэндаў ($133 млрд). Новыя праекты, як чакаецца, створаць больш за 1,8 млн рабочых месцаў і падтрымаюць аднаўленне эканомікі ПАР пасля крызісу, выкліканага пандэміяй каранавіруснай інфекцыі, паведаміла агенцтва Bloomberg. Прэзідэнт краіны Сірыл Рамафоза заявіў, што пандэмія павысіла неабходнасць нарошчвання інвестыцый у эканоміку. ВУП ПАР у 2020 годзе, як чакаецца, скароціцца не менш чым на 7 працэнтаў. «У доўгатэрміновай перспектыве гэтыя інвестыцыі павялічаць патэнцыял нашай эканомікі, дазволяць скараціць кошт транспарту і павысіць надзейнасць паслуг электразабеспячэння і іншых камунальных паслуг», — заўважыў Рамафоза.

## На поўдні Мексікі адбыўся магутны землятрус



Нацыянальная сейсмалагічная служба краіны (SSN) ацаніла яго магнітуду ў 7,5. Паводле яе інфармацыі, эпіцэнтр знаходзіўся ў Ціхім акіяне — за 23 кіламетры на поўдзень ад горада Крусесіта штата Аахака, а гіпацэнтр — на глыбіні 5 км. У населеных пунктах штата Аахака пашкоджаны будынкі (уключаючы бальніцу з заражанымі каранавіруснай інфекцыяй ва Уатулька), адбыліся апоўзні. Два чалавекі загінулі, паведаміў губернатар штата Алехандра Мурат. З-за землятрусу ўзнік пажар на нафтаперапрацоўчым заводзе ў горадзе Салін-Крус, яго работа была спынена, перадаў тэлеканал Once Noticias. Падземныя штуршкі адчуваліся таксама ў федэральнай сталічнай акрузе Мехіка і шэрагу штатаў. Землятрус прывёў да невялікага цунамі, якое, на шчасце, не нанесла вялікай шкоды. Папярэджанні былі абвешчаныя таксама і ў суседніх краінах — Гватэмале, Сальвадоры і Гандурасе.

# ДОМІК У ВЁСЦЫ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— І тут мая сяброўка параіла купіць хату на яе малой радзіме — у вёсцы на Брэстчыне, якая знаходзіцца за 160 кіламетраў ад Мінска, — расказвае Настасся. — Мы з мужам прыехалі ў населены пункт. Пахадзілі па вуліцы, выбралі дом, які спадабаўся. Затым падаліся ў сельсавет. Старшыня сельвыканкама расказала, што на дом і зямельны ўчастак няма дакументаў, і падказала адрас спадчыннікаў, з якімі мы звязаліся. Аказалася, што яны не ўступілі ў спадчынныя правы, але гатовыя даць мне даверанасць на афармленне. На напісала заяву на выклік зямельнай службы, якая адмерала заўленыя мной 14 сотак зямлі. Яшчэ ад 15 я адмовілася. Затым я атрымала тэхпашпарт на дом. Працэдура афармлення заняла каля чатырох месяцаў і каштавала мне 700 рублёў. А прадаўцам я заплаціла, як яны і прасілі, 2000 рублёў. Мы з мужам вельмі задаволеныя набытай маёмасцю — зрабілі рамонт звонку і ўнутры, замянілі агароджу, на наступны год разаб'ём кветнікі, невялікія градкі, каб летам мець пад рукой і пятрушку, і салату, і кроп, і іншую зеляніну. Мы раім пераняць наш вопыт і іншым маладым парам. Напрыклад, на суседнім хутары прадаецца хаціна ўсяго за 650 рублёў. Аднак там неабходна добра пастарацца, каб давесці яе да ладу. Ды і грошай у рамонт укласці трэба нямала. А можна наогул знесці пабудову ды ўзвесці новы дом — вядома, калі дазваляюць фінансы. Але скажу, што знаходзіцца хаціна на ўскрайку лесу, побач невялікае возера. Словам, цішыня, раздолле і спевы птушак.

Сапраўды, у аддаленых ад Мінска і вялікіх гарадоў вёсачках, асабліва там, дзе няма чыгункі, не ходзяць маршруткі, дом можна набыць у залежнасці ад яго стану за 200–500 долараў у эквіваленце. Больш дыхтоўныя і моцныя каштуюць даражэй, у межах 1000–2000 долараў.

А што, калі чалавек прывык да выгод цывілізацыі і марыць пра ўтульны дамок непадалёк ад сталіцы, ці магчыма ажыццявіць сваю мару, напрыклад, у Валожынскім раёне і колькі яна будзе каштаваць? У вёсках раёна ёсць дамы, якія прызнаны безгаспадарчымі. У адных не знайшлося спадчыннікаў, а некаторыя гаспадары наогул адмовіліся афармляць на сябе радавое гняздо. На такія домаўладанні распаўсюджваецца дзеянне Указа Прэзідэнта № 357 «Аб пустуючых і старых дамах». Пасля рашэння суда яны пераходзяць ва ўласнасць сельсавета. Што з імі рабіць далей, вырашае новы ўласнік. Ёсць два варыянты: знесці і выставіць участкі на аўкцыён або прадаць.

— Канешне, часцей за ўсё дамы ідуць пад знос. У 2019 годзе толькі ў адным Ракаўскім сельсавеце прададзена з аўкцыёну 28 участкаў на суму 253 тысячы рублёў, — кажа **старшыня Валожынскага раённага Савета дэпутатаў Пётр БІБІК.** — Гэта можа быць і акультураны ўчастак, але здараецца, што грамадзяне набываюць зямлю пад будаўніцтва новага жылля з умовай зносу старога.

Частка сельсаветаў Валожынскага раёна — Ракаўскі, Дорскі, Пяршайскі, Івянецкі — знаходзіцца ў аўкцыённай зоне і выстаўляе зямельныя ўчасткі на таргі.

Першапачатковы кошт надзелу залежыць ад кадастравай цаны на зямлю. Яна па раёне адрозніваецца. У Ракаўскім сельсавеце, які мяжуе з Мінскім раёнам, даражэй, у аддаленых — ніжэй. Кадастравы кошт па кожным сельсавеце вызначае Белгіпразем або іншая спецыялізаваная арганізацыя.

Попыт на зямельныя ўчасткі ёсць. Гэта абумоўлена блізкасцю раёна да сталіцы, а таксама прыгожымі мясцінамі. Некаторыя населеныя пункты знаходзяцца ў Налібоцкай пушчы або на яе ўскрайку. На Валожыншчыне захавалася і шмат хутароў, якія былі вельмі распаўсюджаны да 1939 года. Домікі, што стаяць асобна, асабліва прыцягальныя для пакупнікоў: іх набываюць пад дачы, аграсядзібы. Калі раней людзі ахвотна куплялі дамы ў межах 30 кіламетраў ад Мінска, то цяпер — да 80–100.

— Яшчэ ў 2007 годзе, калі пачынаў работу ў райвыканкаме, у вёсках было шмат непрыглядная пустуючага жылля, а цяпер нават у самых аддаленых маланаселеных паселішчах яно практычна раскуплена, прыведзена або прыводзіцца ў парадак. Хтосьці зносіць будынкі, а нехта займаецца іх рэканструкцыяй, — канстатуе Пётр Бібік.

Летась на Валожыншчыне знесена 57 пустуючых і старых дамоў, у грамадскі сельскагаспадарчы севазварот прыцягнута амаль 50 гектараў зямлі. Сёлета ў рэестр уключаны 22 домаўладанні.

Так што займець нерухомасць або зямлю паблізу Мінска цалкам рэальна, а адначасова і справу сваю адкрыць. Апошнія гады заканадаўчая база прадугледжвае льготы для бізнесу ў сельскай мясцовасці. Напрыклад, тут закрылася шмат крам спажывецкааперацыі, якія цяпер можна набываць пад розныя віды дзейнасці — у тым ліку і для гандлю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Камунальныя стасункі

# БОЛЬШ ЗА ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ЗАЯВАК

### Чаму так важна своечасова касіць траву на гарадскіх газонах?

**З 1 мая да 17 чэрвеня ў сталічную службу 115 гараджане адправілі больш за дзве тысячы заявак, якія датычацца пакосу травы. І калі разглядаць статыстыку па днях, то менавіта ў чэрвені назіраецца значны рост іх колькасці. Разбіраемся, як часта трэба касіць газоны.**

Партэрныя газоны неабходна касіць кожныя дзесяць дзён, калі вышыня травы дасягае дзесяці сантыметраў. Да такіх газонаў можна аднесці тыя, што знаходзяцца ў парадных месцах аб'екта азелянення, з'яўляюцца аднароднымі па афарбоўцы, вышыні і гушчыні травы. На тэрыторыі паркаў і лесапаркаў гэтыя работы выконваюць толькі на адлегласці пяці метраў здоўж дарожак кожныя 14 дзён.

— На лугавых газонах, якія складаюцца з мноства розных відаў траў і кветак, дапускаецца вышыня травы звыш 25 сантыметраў, а на аб'ектах, якія адносяцца да катэгорыі «Цэнтр», траву павінны касіць кожныя 10–14 дзён, калі яе вышыня дасягае дзесяці сантыметраў, — адзначае **кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і захаванні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі УП «Мінскзеленбуд» Анжаліка ПУЗАНКОВА.** — Пасля касьбы вышыня травы павінна быць не ніжэй за тры-чатыры сантыметры, інакш газон будзе сапсаваны. Напрыклад, на галоўных праспектах газон косяць, калі ў вышыню трава дасягае 10—12 сантыметраў, у іншых месцах пакос могуць рабіць, калі вышыня травы і 15—20 сантыметраў. І гэта ў ідэальных умовах, бо пакасіць траву адначасова ва ўсім горадзе немагчыма, асабліва ў дождж.

Пры гэтым выконваць работы па пакосе травы трэба рэгулярна. Калі гэтага не рабіць, то на газоне будуць утварацца купіны і з'яўляцца пустазелле.

— І гэта вельмі дрэнна, бо, напрыклад, у дзьмухаўцоў ці хрэну больш развітая каранёвая сістэма, што дазваляе ім выціскаць культурныя расліны. Яны больш устойлівыя ў прыродным асяроддзі, асабліва ў засуху. Таму ў спёку газон вельмі важна не толькі касіць, але яшчэ і перыядычна падкормліваць і паліваць. Акрамя гэтага, рэгулярны пакос добра адбіваецца на экалагічным стане — гарадскія дрэвы, асабліва здоўж дарог, знаходзяцца ў больш прыгнечаным стане, чым у тых жа парках. І, як высветлілі навукоўцы, у такіх выпадках менавіта трава ачышчае паветра лепш, чым дрэвы, — тлумачыць Анжаліка Васілеўна.

Пры гэтым даглядаць газон трэба не толькі летам — прадугледжаны нават цэлы комплекс круглагадовых мерапрыемстваў. Напрыклад, у вясновы перыяд камунальнікі ачышчаюць газоны ад смецця і солі, якія назбіраліся зімою, а для актыўнага росту травы выконваецца аэрацыя глебы. У сваю чаргу зімой неабходна штыкаваць снег, які прыбіраюць на газоны з тратуараў і дарожак.

**Валерыя КІСЛАЯ.**


# УВАГА!
## ПАСТУПАЕМ У АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ

Научно-методическое учреждение
«НАЦИОНАЛЬНЫЙ ИНСТИТУТ ОБРАЗОВАНИЯ»
Министерства образования Республики Беларусь

### ОБЪЯВЛЯЕТСЯ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ
за счет средств республиканского бюджета
**на 2020 год**

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ:**

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (1 место на обучение в форме соискательства);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (1 место на обучение в дневной форме, 8 мест на обучение в форме соискательства);
13.00.03 «Коррекционная педагогика (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия)» (1 место на обучение в дневной форме).

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ:**

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования» (1 место на обучение в дневной форме);
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» (1 место на обучение в дневной форме).
13.00.03 «Коррекционная педагогика (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия) (2 места на обучение в дневной форме);
19.00.07 «Педагогическая психология» (1 место на обучение в форме соискательства).

**Осуществляется также обучение в аспирантуре и докторантуре за счет собственных средств**

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В АСПИРАНТУРЕ:**

09.00.11 «Социальная философия»;
13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования»;
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»;
13.00.03 «Коррекционная педагогика» (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия);
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии»;
19.00.05 «Социальная психология»;
19.00.07 «Педагогическая психология»;
22.00.06 «Социология культуры».

**СПЕЦИАЛЬНОСТИ ОБУЧЕНИЯ В ДОКТОРАНТУРЕ:**

13.00.01 «Общая педагогика, история педагогики и образования»;
13.00.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)»;
13.00.03 «Коррекционная педагогика» (сурдопедагогика и тифлопедагогика, олигофренопедагогика и логопедия);
19.00.01 «Общая психология, психология личности, история психологии»;
19.00.05 «Социальная психология»;
19.00.07 «Педагогическая психология».

**Прием документов с 1 августа по 30 сентября.**
**Вступительные испытания будут проходить с 1 по 20 октября.**
**Начало занятий – 1 ноября.**
С условиями приема можно ознакомиться в разделе «Аспирантура / Докторантура» национального образовательного портала **www.adu.by.**
Обращаться по адресу: **220004, г. Минск, ул. Короля, 16, каб. 110.**
Контактные телефоны: **+375 (17) 200 53 38, +375 (17) 229 19 59**

УНП 190374888

**С 1 августа по 30 сентября 2020 года**
БУДЕТ ОСУЩЕСТВЛЯТЬСЯ ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ
### В АДЪЮНКТУРУ
**Университета гражданской защиты МЧС Беларуси**
**по специальностям:**
05.26.01 – охрана труда (топливная и химическая промышленность) (1 место – получение образования в форме соискательства);
05.26.02 – безопасность в чрезвычайных ситуациях (1 место – заочная форма получения образования, 1 место – получение образования в форме соискательства);
05.26.03 – пожарная и промышленная безопасность (1 место – заочная форма получения образования);
05.26.07 – гражданская оборона (1 место – получение образования в форме соискательства).
Телефон для справок – **8 (017) 345-33-54**
УНП 192695026

### КОНТРОЛЬНЫЕ ЦИФРЫ ПРИЕМА ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ ПОСЛЕВУЗОВСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ
**за счет средств республиканского бюджета в учреждении образования «Белорусская государственная академия авиации» на 2020 год**
(выкопировка из приказа ГКНТ от 22.05.2020 № 150)

| Организация-исполнитель | Организация-заказчик | Шифр специальности | АСПИРАНТУРА | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Всего | Из них по форме обучения: Дневная | Заочная | Соискательство |
| УО «Белорусская государственная академия авиации» | Организация – исполнитель | 05.22.14 | 1 | 0 | 1 | 0 |
| | Министерство обороны Республики Беларусь | 05.22.14 | 2 | 0 | 1 | 1 |
| | | | 3 | 0 | 2 | 1 |

**ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ ОСУЩЕСТВЛЯЕТСЯ с 1 августа по 30 сентября 2020 года**
**по адресу: г. Минск, ул. Уборевича, 77, тел. 345 32 81, УО «Белорусская государственная академия авиации».**
**Начало занятий – 1 ноября 2020 года**
УНН 100005688

**Национальный центр законодательства и правовых исследований Республики Беларусь**
### ОБЪЯВЛЯЕТ В 2020 ГОДУ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ
**для обучения за счет средств республиканского бюджета по следующим специальностям:**

| Специальность | Количество мест, форма обучения |
|---|---|
| 12.00.03 – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право | 1 соискательство |
| 12.00.06 – земельное право; природоресурсное право; экологическое право; аграрное право | 1 заочная |
| 12.00.08 – уголовное право и криминология; уголовно-исполнительное право | 1 дневная, 1 заочная |
| 12.00.10 – международное право; европейское право | 1 соискательство |
| 12.00.15 – гражданский процесс; хозяйственный процесс; арбитражный процесс | 1 дневная |

**ПРИЕМ ДОКУМЕНТОВ ОСУЩЕСТВЛЯЕТСЯ с 1 августа по 30 сентября 2020 г.**
**по адресу: г. Минск, ул. Берсона, 1А, каб. 301, тел: 200-85-99.**
Подробная информация размещена на сайте: **www.center.gov.by**
УНП 101352704

Сямейная газета
Выпуск № 12 (148)

# КОЛЬКІ ТРЭБА

*Днямі абмяркоўвалі з калегай, як распарадзіцца машынкамі з дзіцячага «аўтапарку», калі, на погляд бацькоў, іх назбіралася ўжо зашмат і многія дастаюцца са скрыні гады ў рады, а на погляд дзіцяці ўсе абсалютна патрэбныя і неабходныя, нават калі яны аднолькавага памеру, колеру і прызначэння. Пляменнік, зноў жа, на дзень нараджэння папрасіў: «Толькі не машынку, калі ласка! У мяне іх ужо, мо пяцьдзясят! Лепш кніжку цікавую, ці зборную мадэль, ці грошы, але на крайні выпадак». З апошнім пунктам, дарэчы, я згодная цалкам. На мой погляд, падарыць чалавеку (не важна нават, маленькаму ці дарослaму) грошы — значыць не пажадаць «замарочыцца», праявіць увагу і разабрацца, што яму цікава, што патрэбна, што, быць можа, ён сам сабе ніколі не набудзе, але парадуецца, калі гэта зробіць нехта іншы... Зрэшты, паразважаць сёння хочацца не пра гэта.*

*Адзін з колішніх герояў «Сямейнай газеты» ўспамінаў, што веласіпед яму падарылі пасля трэцяга класа, а ганяў на ім ажно да заканчэння школы, і гэта быў — ух які важны, патрэбны і любімы падарунак. А свайму сыну ён набыў першы ровар, калі малому не было яшчэ трох гадоў; потым другі, трэці. Як меркаваў мой суразмоўца, колькасць цацак, кніжак, усемагчымых развіваючых прылад і канструкцый у нашых дзяцей, усяго праз адно пакаленне, вырасла ў некалькі разоў, а вось уменне цаніць іх, наадварот, паменшылася. І з аднаго боку, гэта як быццам няблага: усведамленне дзіцем, што сапсаваная, нават новая і дарагая, рэч — гэта ўсяго толькі рэч, а не канец свету. А з другога — уяўляю, як крыўдна бацькам, якія адкладвалі грошы, каб набыць нятанную цацку ці забаўку, літаральна вымаленую ўсякімі абяцанкамі, узорнымі паводзінамі, ныццём і катаннем, — а яна, аказваецца, была патрэбная толькі дзеля самога факта ўладання, таму што «ва ўсіх такія ёсць», і пасля тыдню выкарыстання ляжыць недзе ў кватэры, пакрываецца пылам...*

*Напэўна, стаўленне да рэчаў наогул і цацак у прыватнасці закладваем у дзецях мы самі — старэйшае пакаленне бабуль і дзядуль, якое да паўналецця будзе ўспамінаць унуку, як той вымазаў марожаным новы касцюмчык, альбо, наадварот, у кожны прыезд будзе завальваць малых падарункамі («ну і што, што гэта дзясятая лялька, няхай у дзетак будзе тое, чаго ў нас не было»), і бацькі, дзядзькі і цёткі, якія з маленства перадаюць на дзіцячыя дні народзін грошы ў канверціку альбо загадзя распытваюць, пра што марыць іменіннік, і выбіраюць замоўленае разам з ім, тлумачаць і паказваюць, як карыстацца сучаснымі забаўкамі. Але ёсць, мабыць, і нейкія ўнутраныя настройкі, якія залежаць не ад матэрыяльнага статусу сям'і, а толькі ад характару асобы і якія немагчыма перарабіць на жаданы лад, хіба толькі скарэкціраваць. Нездарма ж адны дзеці ўмеюць, як тое асляня Іа, радавацца нават паветранаму шарыку (і нават калі ён ужо не зусім шарык), а другім што ні зрабі, усё не тое і не так — гарохі на бантах не таго памеру, кнопак у радыёкіраванні мала і наогул, хацелася з перламутравымі гузікамі, а не ваша «вось гэта ўсё».*

*У дзяцінстве гэта здаецца часам нават мілым, а вось у дарослым узросце выглядае бідаваочным, наўмысным і раздражняльным. Вось чаму асабіста мне вельмі прыемна сустракаць людзей, якія ўмеюць захоўваць разумны баланс паміж жаданым і магчымым, цаніць дробязі, не забываюцца дзякаваць. Балазе, такіх прыкладаў перад вачыма заўжды хапае. Скептыкі заўважаць: проста ты бачыш тое, што хочаш убачыць. А я запярэчу: падобнае прыцягвае падобнае. Квантавая фізіка і закон сусветнага прыцягнення ў дзеянні.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Жыві і квітней, Беларусь! Наш дом

# ЯК МЛАДА, МАРГАРЫТА І МАЦВЕЙ СТАЛІ НАВАСЁЛАМІ

## Большасць шматдзетных сем'яў гродзенцаў атрымліваюць жыллё ў новых шматпавярхоўках



**У Гродне актыўна забудоўваюць новыя мікрараёны. Значная частка кватэр адводзіцца менавіта шматдзетным сем'ям. Алена і Антон Дзмітрыевы нядаўна атрымалі новае жыллё ў адным з такіх дамоў па вуліцы Асфальтнай, што ў мікрараёне Грандзічы-2.**

### З інтэрната — у новую кватэру

Паўночны мікрараён Грандзічы — перспектыўная забудова. Гэта адзін з самых значных будаўнічых праектаў, дзе шматпавярхоўкі растуць як грыбы. Дабрацца ў новы раён нескладана — сюды ходзіць і гарадскі транспарт, і маршруткі. Грандзічы-2 выглядаюць добраўпарадкавана — і дарожная, і дваровая інфраструктура радуе вока сваім сучасным выглядам. Таксама адметная рыса новага мікрараёна — гаражы для ровараў, якія, дарэчы, не пустуюць.

Вось у такім утульным дворыку па вуліцы Асфальтнай мы і сустрэліся з Аленай Дзмітрыевай. Яе сям'я нядаўна пераехала ў новы дом з інтэрната. Для жанчыны вельмі важна, што дворык свабодны ад аўтатранспарту, а яго тэрыторыя — сапраўдны варкаўт для дзяцей з мноствам аб'ектаў і нават штучным пакрыццём.

Алёна наглядае за двума малымі дочкамі — Младай і Маргарытай. Старэйшы сын Мацвей застаўся дома. Пакуль дзяўчынкі гойдаюцца на арэлях, мы можам пагаварыць на самую актуальную для сям'і тэму — жыллёвую: ці сапраўды падтрымка дзяржавы ў гэтым пытанні для шматдзетных сем'яў адчувальная? Але пра ўсё па парадку.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Мужчынскае выхаванне

# ВАРТА ЗАХОЎВАЦЬ СЯМ'Ю ДЗЕЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Грамадская арганізацыя «Савет бацькоў» горада Мінска — гэта аб'яднанне мужчын, якія вырашылі садзейнічаць рэалізацыі ўсвядомленага, абдуманага, адказнага бацькоўства. Тут вераць, што тата — ключавы чалавек у жыцці кожнага дзіцяці. Напярэдадні Міжнароднага дня бацькі (адзначаецца 21 чэрвеня) суполка запусціла першы ў Беларусі конкурс «Бацька года». Сярод крытэрыяў, па якіх адбіралі прэтэндэнтаў, галоўныя наступныя: мужчына павінен быць жанатым, а ўсе дзеці — народжаны ў адным шлюбе. Мы сустрэліся са старшынёй ГА «Савет бацькоў» Аляксандрам Вялічкам, каб пагаварыць пра сучасных тат, сям'ю і шчасце.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Пераможца конкурсу «Бацька года» Павел ДУРНОЎ.

Быць раЗАм

# ПРАЗ АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі правёў рэспубліканскі сямейны інтэрнэт-чэлендж «#раЗАм з бацькам», які быў прымеркаваны да Дня бацькі, паведаміла сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Юлія ЗІНКЕВІЧ.**

Па яе словах, сямейны праект «ТатаЗала» крыху перайначыўся. Напярэдадні Дня бацькі, які святкуюць ва ўсім свеце ў трэцюю нядзелю чэрвеня, усіх бацькаў запрасілі актыўна ўключыцца ў інтэрнэт-чэлендж «#раЗАм з бацькам». Неабходна было стварыць відэаролікі пра тое, як таты і іх маленькія дзеці разам займаюцца фізічнай культурай. Гэта маглі быць ранішняя зарадка, сілавыя практыкаванні, спартыўныя гульні — як дома, так і на свежым паветры.



Відэаролік неабходна было зняць у гарызантальным фармаце працягласцю да адной хвіліны і выкласці на асабістых старонках у сацсетках, суправаджаўшы яго хэштэгамі праекта #папазал #деньотца, #раЗАмзбацькам і абавязкова адзначыўшы @brsmby.

Інтэрнэт-чэлендж «#раЗАм з бацькам» быў скіраваны на захаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, умацаванне і развіццё бацькоўска-дзіцячых адносін і папулярызацыю здаровага ладу жыцця.

Да сямейнага спартыўнага праекта далучыліся многія вядомыя ў краіне людзі разам са сваімі дзецьмі. Напрыклад, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, кандыдат у майстры спорту па лёгкай атлетыцы Ігар Завалей, трэнер хакейнага клуба «Дынама-Мінск» Міхаіл Грабоўскі, майстар спорту міжнароднага класа, пяціразовы чэмпіён свету па гіравым спорце Ігар Сігневіч, дырэктар «Славянскага базару» Глеб Лапіцкі і многія іншыя. Усе бацькі выдатна ўсведамляюць, што толькі асабістым прыкладам можна прывіць дзецям жаданне мець здаровы спосаб жыцця. Асабліва важна разумець, што толькі агульнымі намаганнямі ўсіх зацікаўленых можна вырасціць здаровую нацыю і перадолець любыя праблемы.

Варта адзначыць, што 1 чэрвеня з ініцыятывы моладзі Гродзенскай вобласці стартаваў сямейны рэспубліканскі маладзёжны праект «#раЗАм з бацькамі», падчас якога бацькі і іх дзеці пры падтрымцы валанцёраў руху «Добрае сэрца» добраўпарадкоўваюць дзіцячыя пляцоўкі.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з сайта БРСМ.**

Ёсць пытанне!

# «АДДАЛЕНКА» З АСАБЛІВЫМІ ПАТРЭБАМІ

**Закрытыя ў чатырох сценах, пазбаўленыя звыклых кантактаў, хлопчыкі і дзяўчынкі з асаблівасцямі, напэўна, пацярпелі ад эпідэміі каранавіруса больш за іншых дзяцей. Нават самыя сацыялізаваныя з іх не змаглі пераключыцца на заняткі ў анлайне. Пра гэта заявілі ўдзельнікі відэамоста, што прайшоў у мультымедыйным прэс-цэнтры «Sputnik Беларусь».**



Каранавірус стаў сур'ёзным выпрабаваннем для беларускага Сямейнага інклюзіўнага тэатра «і», сярод 130 выхаванцаў якога каля 40 маюць складаны дыягназ. Яшчэ зусім нядаўна тэатр імкліва развіваўся, набіраў прыхільнікаў, юныя акцёры ўжо збіралі на сваіх спектаклях тысячныя залы. За чатыры гады існавання яны выходзілі на публіку 41 раз! Больш за 16 тысяч гледачоў купілі білеты, а яшчэ былі і дабрачынныя выступленні. Хлопчыкі і дзяўчынкі прызвычаіліся да таго, што яны на сцэне. Але нават тыя дзеці з аўтызмам, якія ўжо былі сацыялізаваныя, удзельнічалі ў рэпетыцыях і спектаклях, спакойна прыстасоўваліся да новых умоў, — не змаглі перайсці ў анлайн. З 43 артыстаў з дыягназам толькі з дзясятак змаглі падключыцца да заняткаў у інтэрнэце. І калі з'явілася шмат рамак і абмежаванняў, у многіх дзетак пачаўся зваротны працэс.

«Мы перабудавалі ўсю сваю праграму, усім педагогам давялося тэрмінова давучвацца, каб разумець, як працаваць у анлайне, знайсці кантакт, практыкаванні, якія былі б цікавыя. Увялі індывідуальныя заняткі, — дзеліцца **мастацкі кіраўнік Сямейнага інклюзіўнага тэатра «і» Ірына КІСЯЛЁВА**. — Але дзеці моцна сумуюць. Да 15 хвілін урока ў нас можа пайсці толькі на тое, што яны махаюць адно аднаму».

Каранавірус сарваў многія планы тэатра: у маі артысты павінны былі выходзіць на сцэну з прэм'ерай. Але нават ва ўмовах самаізаляцыі творчая каманда рыхтуе новы спектакль: піша музыку, працуе над сцэнарыем, анлайн праходзяць рэпетыцыі. І калі каранакрызіс не скончыцца, артысты плануюць выпуск спектакля ў інтэрнэце.

У час пандэміі псіхолагі Ерэвана назіралі за тым, як хлопчыкі і дзяўчынкі з асаблівасцямі ўспрымаюць новыя формы работы. Калі стала зразумела, што заняткі праз інтэрнэт не могуць кампенсаваць ранейшых сустрэч са спецыялістамі, давялося пераглядзець стратэгію. «Дзіця сілкуецца энергіяй бацькоў. Калі бацькі эмацыянальна закрытыя, перажываюць (хоць, магчыма, яны пра гэта не згадваюць), дзіця па розных невербальных знаках будзе адчуваць трывогу. Таму мы зрабілі ўпор на работу з бацькамі. Важна даць ім рэсурсы, каб яны маглі пераадолець крызіс», — расказала **клінічны псіхолаг, спецыяліст па развіцці дзяцей з асаблівасцямі з Ерэвана Анаіт АЙКАЗУНІ**.

Сапраўды, многія сем'і, у якіх растуць такія дзеткі, падчас пандэміі адчулі сябе разгубленымі, калі іх малыя перасталі атрымліваць кваліфікаваную дапамогу, але толькі не тыя, хто раней сам удзяляў вялікую ўвагу развіццю сваіх сыноў і дачок. «Як сям'я, у якой расце хлопчык з дыягназам «аўтызм», мы ўжо даўно зведалі, што такое ізаляцыя. Прычым больш складаная, жорсткая — псіхалагічная. Калі дзіцяці было тры — тры з паловай гады, мы чулі на дзіцячай пляцоўцы словы накшталт «забярыце яго адсюль» альбо бачылі, як іншым малым не дазвалялі з ім гуляць. Калі сын упаў з горкі, урач адмаўляўся яго глядзець, бо дзіця само не магло расказаць, што адчувае. Многія сябры, знаёмыя перасталі з намі сустракацца, бо мы не ішлі па прынятых шаблонах, таму што ў нас асаблівае дзіця», — заўважыла **Ганна ГРЫГАРАН, заснавальнік праекта «Інклюзіўная сям'я ў Арменіі»**. — І каранцін для нас не стаў праблемай, бо наша сям'я абрала прафесійны шлях, дзе менавіта бацькі нясуць адказнасць за любое, у тым ліку творчае развіццё дзіцяці. Самі па сабе заняткі па 40-60 хвілін у дзень з псіхолагам ці тэрапеўтам не будуць эфектыўныя. Важна пераймаць вопыт і веды ў спецыяліста і пасля выкарыстоўваць гэта самім». Цяпер арганізацыя займаецца тым, што суправаджае сем'і і вучыць бацькоў развіваць дзяцей.

У Грузіі ўрачы-рэабілітолагі сёння прыватна наведваюць дзяцей, якія маюць патрэбу ў спецыяльнай дапамозе. У той жа час некаторыя спецыялісты звязваюцца з сем'ямі анлайн, маніторацьстан пацыентаў. «Я як заснавальнік рэабілітацыйнага цэнтра задумалася пра тое, што неабходна пашыраць межы. Мы павінны мець доступ да спецыяліста незалежна ад тэрытарыяльнага знаходжання, любых умоў. Напрыклад, калі дзіця выязджае на лячэнне ў іншую краіну, важна працягваць узаемадзеянне са сваім спецыялістам, з якім можна звязацца анлайн, і дзіця будзе бачыць знаёмы твар», — выступае за пашырэнне інтэрнэт-супрацоўніцтва **заснавальнік дабрачыннага фонду «Серафім» Лія СЯРГЕЕВА**.

А вось **прэзідэнт фонду «Мы — іншыя» і дырэктар Цэнтра інтэграцыйнай медыцыны Miraculum Андрэй МАКСІМАЎ** упэўнены, што пераход у анлайн у пытаннях, якія датычацца работы з асаблівымі дзецьмі, недапушчальны: калі будуць узнікаць такія сітуацыі, што людзей абавязваюць сядзець у чатырох сценах, каранціну павінны быць пазбаўлены сем'і са складанымі дзецьмі. Гэта, на думку Андрэя Максімава, неабходна замацаваць заканадаўча — рэабілітацыю трэба прыраўняць да неабходнага лячэння. Сёння хапае памяшканняў для таго, каб арганізоўваць індывідуальныя заняткі.

Наогул работа з дзецьмі з асаблівасцямі павінна мяняцца. Такім пацыентам неабходна комплексная дапамога. «Аўтызм — настолькі складаная рэч, што аднаму спецыялісту практычна немагчыма з ёй разабрацца. Сёння аказваць дапамогу павінна каманда, у якую будуць уваходзіць імунолаг, эндакрынолаг, гастраэнтэролаг, педыятр і многія іншыя спецыялісты, нават стаматолаг. Пры гэтым узначальвае групу біёлаг, які аналізуе ўсе працэсы з пункту гледжання біямедыцыны, і каманда сумесна распрацоўвае пратакол», — расказаў Андрэй Максімаў.

Важна, каб усю дапамогу ад дыягностыкі да лячэння і рэабілітацыі дзеці маглі атрымліваць у адным месцы, асабліва ў неспакойнай эпідэміялагічнай сітуацыі, бо сёння бацькам даводзіцца туляцца з дзецьмі па шматлікіх установах, кутках горада, каб трапіць да розных спецыялістаў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ЯК МЛАДА, МАРГАРЫТА І МАЦВЕЙ СТАЛІ НАВАСЁЛАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Як аказалася, дагэтуль Дзмітрыевы жылі ў інтэрнаце блочнага тыпу. Напачатку займалі адзін пакой, а з нараджэннем другога дзіцяці ім аддалі ўвесь блок плошчай 37 «квадратаў».

— Мы не ставілі канкрэтных планаў па колькасці дзяцей, — усміхаецца Алена. — Пасля таго як нарадзіўся Мацвей, хацелі яшчэ дзіця, але доўгі час не маглі гэта ажыццявіць. Толькі праз восем гадоў нарадзілася Маргарыта, а потым, у наступным годзе, нечакана з'явілася Млада. Напачатку было даволі складана спраўляцца адразу з дзвюма малымі, але цяпер яны сябруюць і разам бавяць час.

**Плануецца, што сёлета будуць забяспечаны жыллём усе 1300 шматдзетных гродзенскіх сем'яў, якія стаяць у чарзе.**

Дзяўчынкі раз-пораз падбягаюць да мамы, каб нешта сказаць. Адной хочацца з'ехаць з горкі, другой — пайсці на складаром. Робім паўзу, каб задаволіць жаданні малых і суправадзіць іх па інтарэсах. Здаецца, што цярпенне і дабрыня Алены закладзены ў ёй з дзяцінства. Але аказалася, што гэта далёка не так.

Сама Алена не ведае, што такое расці з матулінай пяшчотай. Яна сірата з самага маленства, прайшла і праз дом немаўляці, і праз інтэрнаты. Але і на яе лёс хапіла дабрыні. З удзячнасцю ўспамінае, як жыла ў доме сямейнага тыпу, дзе адчула і клопат, і цяпло бацькоў-выхавацеляў. Мабыць, з таго часу і ўмацавалася гэтае жаданне — мець сваю моцную сям'ю. Для Алены яе муж — і дарадчык, і памочнік, і надзейная апора ў жыцці. Цяпер на яго плячах — рамонт у новай кватэры.

— Мы вырашылі браць кватэру без рамонту, бо так выходзіла танней, — удакладняе Алена. — Падумалі, што пацічу самі справімся. Асноўныя работы ўжо зрабілі. Галоўнае, што ёсць утульная трохпакаёўка, дзе можна ўсім размясціцца.

Па словах жанчыны, напачатку стаялі ў чарзе на жыллё як маладая сям'я, а літаральна праз год — ужо як шматдзетная. З улікам новых мер па падтрымцы шматдзетных сем'яў Дзмітрыевы скарысталіся правам на паскоранае атрыманне жылля, прычым з даволі значнай дзяржаўнай субсідыяй. Такое права гарантуецца Указам № 240 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## Зарплата застаецца ў сям'і

Як растлумачылі ў аддзеле жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскага гарвыканкама, субсідыя накіроўваецца на пагашэнне працэнтнай стаўкі па крэдыце. Яго банк выдае на будаўніцтва жылля. А субсідыя дазваляе ў значнай меры пагасіць гэту пазыку.

Механізм усёй працэдуры наступны. Сям'я стаіць на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў па месцы жыхарства. Потым, згодна з чаргой, уступае ў склад жыллёва-будаўнічага спажывецкага кааператыву (ЖБСК). Адміністрацыя раёна прымае рашэнне аб выдзяленні дзяржаўнай падтрымкі ў выглядзе субсідыі як на пагашэнне асноўнай пазыкі, так і на пагашэнне часткі працэнтаў па крэдыце. І ўжо ў адпаведнасці з гэтым рашэннем сям'я звяртаецца ў банк і бярэ крэдыт на будаўніцтва жылля. Шматдзетная сям'я, дзе растуць трое дзяцей, можа разлічваць на пагашэнне асноўнай пазыкі ў памеры 95 %. А тыя, у каго дзяцей чацвёра і больш, маюць права на стапрацэнтнае пагашэнне.

Працэдура хоць і займае нейкі час, але для Алены і яе сям'і ўвесь «папяровы» перыяд завяршыўся ўдала. І з выбарам пашанцавала — пры лёсаванні муж выцягнуў даволі зручны шосты паверх.

— Вядома, давялося сабраць мноства паперак, даведак, але лічу, што мы атрымалі кватэру даволі хутка — у чарзе стаялі не больш за тры гады ў статусе шматдзетнай сям'і. Цяпер кожны месяц плацім па крэдыце 80 рублёў, — расказвае Алена.

Субсідыя на жыллё — не адзіная дзяржаўная падтрымка. Шматдзетная сям'я мае права на атрыманне мацярынскага капіталу. Па словах Алены, пакуль яны не вырашылі, як ім скарыстацца. Магчыма, таксама для вырашэння кватэрнага пытання — дзеці ж растуць. Праўда, цяпер тэрмін выкарыстання абмежаваны 2024 годам. Але да гэтай пары, разважае жанчына, павінны вызначыцца. Зараз галоўны клопат — гэта дзеці. Дзяржаўная субсідыя дазволіла амаль усю зарплату пакінуць у сям'і. А гэта значыць — ёсць магчымасць патраціць грошы на дзяцей, зрабіць іх жыллё больш камфортным.





## «Адзін з бацькоў павінен працаваць»

Шматдзетныя сем'і ў Гродне атрымліваюць новыя кватэры менавіта ў мікрараёне Грандзічы. Плануецца, што сёлета будуць забяспечаны жыллём усе 1300 шматдзетных гродзенскіх сем'яў, якія стаяць у чарзе. У далейшым мяркуецца скараціць тэрмін чакання жылля да аднаго года.

Пра дзейснасць такіх планаў добра ведае старшыня ЖБСК Наталля Сасім. Яна кіруе двума дамамі, якія цяпер узводзяцца ў асноўным для шматдзетных сем'яў. Умовы, па яе словах, даволі спрыяльныя для навасёлаў — 873 рублі за квадратны метр. Шматдзетным сем'ям гэты кошт пагашае дзяржава праз субсідыі.

— Ёсць у нашым жыллёвым кааператыве маці-гераіня, у якой шасцёра дзяцей. Яна жыве ў двухпакаёўцы і цяпер будуе трохпакаёвую кватэру. Як і ва ўсіх членаў кааператыва, у яе адкрыта крэдытная лінія. Згодна з 240-м указам, усе работы па будаўніцтве аплачвае дзяржава. Калі не будзе хапаць субсідыі, жанчына зможа пагасіць частку крэдыту мацярынскім капіталам. Так многія робяць, і гэта значны плюс у такой сітуацыі, — расказвае Наталля.

Сярод удзельнікаў жыллёвага праекта — у асноўным шматдзетныя сем'і. Ёсць і маці-адзіночкі, якія выхоўваюць траіх дзяцей. Дзякуючы субсідыям і мацярынскаму капіталу яны могуць дазволіць сабе аплату новай кватэры, прычым з рамонтам. Пры гэтым банку выплачваюцца невялікія працэнты. Паколькі чарга сярод шматдзетных таксама немалая, крэдытныя лініі адкрыты ў пяці банках краіны.

**Шматдзетная сям'я, дзе растуць трое дзяцей, можа разлічваць на пагашэнне асноўнай пазыкі ў памеры 95 %. А тыя, у каго дзяцей чацвёра і больш, маюць права на стапрацэнтнае пагашэнне.**

— Здараецца, што крэдыты немагчыма адкрыць, бо бацькі не працуюць. Яны жывуць на дзіцячую дапамогу. Але адзін з бацькоў абавязкова павінен працаваць, толькі тады можна разлічваць на дапамогу дзяржавы, і гэта справядліва, — лічыць Наталля.

Увогуле для шматдзетных сем'яў нямала льгот. У свой час старшыня ЖБСК адчула іх на ўласнай сям'і. Гэта і летнікі, і розныя паездкі, і наведванне культурных устаноў, паркаў. Сын ужо дарослы, закончыў ваенную акадэмію, дзве дачкі-пагодкі — вучацца ў школе.

— Я і сама будавала кватэру як шматдзетная маці ў 2010 годзе, — кажа суразмоўніца. — Мы атрымалі трохпакаёўку і з'ехалі ад бацькоў. Згодна з 13-м указам, нам адкрылі ільготнае крэдытаванне, па якім мне трэба выплаціць 25 % кошту кватэры. Цяпер я плачу ў месяц 4 рублі, а 75 % кошту пагашае дзяржава.

У другім паўгоддзі ў Гродне пачнецца ўзвядзенне жылля ў мікрараёне Грандзічы-3. Для шматдзетных сем'яў прадугледжана амаль 40 чатырохпакаёвых кватэр. Усяго кватэр для гэтай катэгорыі сёлета будзе пабудавана больш за 300. Таксама шматдзетныя сем'і выкарыстоўваюць магчымасць будаваць свае дамы ў раёнах індывідуальнай жылой забудовы. Зямельныя ўчасткі ім выдзяляюцца ў першую чаргу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Сацыяльная кансультацыя

## ДАЎГІ ПА АЛІМЕНТАХ ДЛЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ

### Яны будуць налічвацца па-новаму з 1 ліпеня, згодна са зменамі ў Кодэксе аб шлюбе і сям'і

**Зараз у разліках адштурхоўваюцца ад велічыні сярэдняй зарплаты па краіне, а па новых правілах будзе ўлічвацца памер сярэдняга пражытачнага мінімуму, які сёння складае 247 рублёў.**

Цяпер, калі даўжнік не працуе (або больш чым тры месяцы таму звольніўся з работы), аліменты ўтрымліваюцца зыходзячы з памеру сярэдняга заробку па краіне. 25 % — на адно дзіця, 33 % — на двух і 50 % — на траіх і больш.

А з 1 ліпеня даўжнікі-аліментшчыкі, якія не працавалі або не падалі дакументы, што пацвярджалі б іх заробак, будуць плаціць палову бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ), а менавіта 123 рублі, на ўтрыманне аднаго дзіцяці. 100 % БМП налічаць на двух дзяцей і 150 % — на трох і больш малых.

Нагадаем, што аліменты ў Беларусі налічваюцца з усіх рэгулярных відаў заробку, у тым ліку з пенсій. Спіс даходаў для аліментаў вызначаецца ўрадам, выключэннем могуць быць толькі камандзіровачныя або іншыя неасноўныя даходы. Зменшыць суму аліментаў на дзяцей можа выключна праз суд, але толькі па аб'ектыўных прычынах і, хутчэй за ўсё, на пэўны тэрмін.

Часцей за ўсё аліменты спаганяюць з бацькоў на дзяцей, калі дарослыя не ўтрымліваюць малых. Аднак атрымліваць аліменты могуць таксама непрацаздольныя былыя (і нават наяўныя) муж ці жонка. Пры пэўных умовах аліменты могуць плаціць нават паўналетнія дзеці непрацаздольным бацькам.

Для налічэння аліментаў неабходны наступныя ўмовы. Аліменты прызначаюць на ўтрыманне асобы, якая аб'ектыўна не можа забяспечваць сябе. Плацельшчык і атрымальнік аліментаў павінны быць звязаны ці сужэнцамі (былымі або знаходзіцца ў шлюбе). Аліментшчык і асоба, якой прызначаны адпаведныя выплаты, не павінны весці агульную гаспадарку.

Асаблівая сітуацыя — калі аліменты прызначаюцца цяжарнай былой жонцы. Такія грошы выплачваюцца жанчыне да родаў, пасля чаго прызначаюцца новыя аліменты — на народжанае немаўля.

Калі атрымальнікам аліментаў з'яўляецца недзеяздольная асоба, немаўля, інвалід у стане поўнай адсутнасці памяці, то атрымліваць грошы павінен другі з бацькоў або апякун.

**Ірына СІДАРОК.**

# ВАРТА ЗАХОЎВАЦЬ СЯМ'Ю ДЗЕЛЯ ДЗЯЦЕЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— «Бацька года» — наш першы такі конкурс. Мы доўга думалі пра крытэрыі, але, зразумела, усе яны вельмі суб'ектыўныя. Пра старт аб'явілі за два тыдні да Дня бацькі, і ў нас вызначыліся 13 намінантаў, за якіх можна было галасаваць у сацыяльных сетках. (Праўленне «Савета бацькаў» прысудзіла званне «Бацька года — 2020» Паўлу Дурнову, ён мае пяць дзяцей. — **Аўт.**) Для нас вельмі важна, каб прэтэндэнт быў сямейным і сацыяльна актыўным чалавекам. Думаю, налета мы падыдзем да адбору яшчэ больш сур'ёзна. Я бываю з лекцыямі ў розных краінах і бачу, што беларусы — народ найбольш арыентаваны на сям'ю, — кажа Аляксандр Вялічка.

Сёння арганізацыі, якой без малога год, удалося рэалізаваць цікавыя і карысныя ініцыятывы. Праходзяць сямейныя велапрагулкі па знакавых мясцінах сталіцы. Рыхтуюцца велапаходы па гістарычных месцах Мінскага раёна. Праводзіцца таксама валейбольны турнір, у якім удзельнічае больш за 40 камандаў. У найбліжэйшы час будзе распачаты Кубак бацькоўства па футболе, які падтрымалі розныя структуры — Міністэрства спорту, гарвыканкам, Міністэрства абароны. Па ініцыятыве аднаго з бацькаў тут узялі шэфства над садам Гашкевіча. Адзін тата займаецца шахматамі — і, як вынік, арганізаваны шахматны атрад. Пры жаданні можна наведваць



Велапрагулка з татамі.

школу блогераў альбо пачынаючых праграмістаў. Кожная актыўнасць тут — гэта магчымасць для дзяцей і бацькаў стаць камандай, сябрамі і яшчэ больш даведацца адно пра аднаго.

— Летась мы ахапілі прыкладна 2,5 тысячы тат. Гэты год выпаў няпросты: у студзені—лютым правялі некалькі семінараў, а потым пачаўся каранавірус. Але сядзім і працуем, бо кірункаў хапае, — дзеліцца Аляксандр Вялічка. — У нас ёсць праграма «Чацвёрты мушкецёр», у рамках якой мы супрацоўнічаем з хлопцамі з Украіны. Сутнасць яе ў тым, што таты з сынамі адпраўляюцца ў экстрэмальны паход. Мы былі ўжо ў Карпатах, на Каўказе, ладзілі сплавы. Гэта 72 гадзіны разам, калі ў вас ёсць толькі нож, запалкі і соль. Летась адсюль у такую вандроўку паехалі 20 бацькаў з дзецьмі — і пасля былі ў захапленні, бо калі ты побач з дзіцем у такіх умовах, то імкнешся дэманстраваць лепшае, што ў табе ёсць.

Потым вырашылі, што трэба нешта прыдумаць і для тат дачок. Так з'явілася ідэя «Тата-балю». Яго сёлета планавалі правесці ў студзені, але спачатку перанеслі на красавік, а потым на снежань. Удзельнікі балю рыхтуюцца разам са студыяй танца «Капітэль» і прадзюсарскім цэнтрам СПАМАШ.

Была ідэя правесці Дзень таты ў Лошыцкім парку. Атрымалі дазвол, але пандэмія парушыла планы. Цікаўлюся між іншым, чаму такое свята ў нашай краіне не мае афіцыйнага статусу. Аказваецца, адмову часцей за ўсё аргументуюць празаічна: «Немэтазгодна. У нас і так шмат святочных дзён». Магчыма, такая сітуацыя ў чымсьці сімвалічная, таму што вельмі шмат у нас гаворыцца пра ролю маці, а тата застаецца на ценявых пазіцыях.

— Хто ў сям'і галоўны? Я перакананы, што толькі бацька, які бярэ на сябе ўсю паўнату адказнасці за жонку і дзяцей, можа называцца мужчынам з вялікай літары, — кажа Аляксандр. — Бацька, якога няма побач з дзецьмі, — дрэнны бацька. Глядзіце, развод сёння — гэта ўцёкі ад праблем. І ніхто не разглядае сям'ю як тое, за што варта змагацца. Чаму у нас няма пэўных мер, якія будуць перашкаджаць яе распаду? Калі нашым людзям даюць тры месяцы на роздумы, то ніхто не ідзе па дапамогу да таго ж псіхолага... Таму ў нашай арганізацыі ёсць ідэя — у тых жа ЗАГСах, судах расказваць пра нашы семінары. І на іх мы растлумачым, што сям'я — гэта не проста жыць разам. Трэба змяніць уяўленне, быццам сям'я — месца выключнага шчасця. Насамрэч там можа быць рознае — канфлікты, нежаданне браць адказнасць, нежаданне разумець і прымаць. Дастаткова ўзяць прыклады з нашага савета, калі мужчыны дэманструюць, што не проста спраўляюцца з абавязкамі, а шчаслівыя быць бацькамі. Многія ж сённяшнія маладыя людзі гэтага не разумеюць. Цяпер папулярная парадыгма, у якой вяселле — фініш, а трэба тлумачыць, што гэта старт.

Тут цяжка не пагадзіцца. Нават у казках, якія дзеці чуюць з дзяцінства, усё заканчваецца фразай «Жылі яны доўга і шчасліва». Аднак за шчасце кожнаму з нас даводзіцца плаціць сваю ўласную цану. Для гэтага недастаткова толькі кахання — патрэбна яшчэ і ўменне дараваць, саступаць у спрэчках і адмаўляцца ад уласнага эгаізму.

— У нас перасталі змагацца за сям'ю. Людзі імкнуцца да асабістага шчасця. Некаторыя нават перакананы, што не варта жыць «дзеля дзяцей», калі тыя будуць назіраць пастаянныя сваркі. На што я кажу: жыць дзеля дзяцей — значыць паводзіць сябе так, каб дзеці не бачылі вашых канфліктаў. Чаму двое дарослых людзей, стварыўшы сям'ю, адчуваюць сябе нешчаслівымі? Сустрэліся дзве адзіноты, два эгаісты, але ці ёсць у такім саюзе месца каханню? Каханне — гэта ж жаданне аддаваць і рабіць іншага шчаслівым, — упэўнены Аляксандр Вялічка. — Вялікая колькасць разводаў абумоўлена выпадковымі шлюбамі. Калі маладыя людзі пачнуць думаць галавой перад стварэннем сям'і, то, можа, палова шлюбаў і не адбудзецца. Але я перакананы: калі навучым маладых людзей правільнаму падыходу да стварэння сям'і, то мы пераломім сітуацыю. І дарослыя, і дзеці павінны быць шчаслівымі.

**Алена ДРАПКО.**

## Бяспека ў доме

# ЗБЕРАГЧЫ РОДНЫХ АД БЯДЫ

**СУЧАСНЫ свет — гэта вечная гонка: за грашыма, прызнаннем, камфортам... У страху не паспець, у жаданні абысці ўсіх мы губляем сябе, грэбуем тым, што маем, і забываем пра важнае. А што самае крыўднае — пакідаем без увагі тых, хто дазволіў нам стаць часткай гэтага свету і даў старт усім распачынанням. Гаворка — пра нашых пажылых бацькоў. У паўсядзённай мітусні мы нават не задумваемся над тым, што тэлефонны званок, прывезены пакет прадуктаў ці лекаў не заменяць галоўнага — клопату пра бяспеку старэйшага пакалення, якая з найбольшай імавернасцю гарантуе ім спакойную старасць.**

Сёння пытанне бяспекі пенсіянераў вельмі вострае. Статыстыка паказвае, што менавіта састарэлыя людзі часцей за ўсё становяцца «героямі» зводак ратавальнікаў. Усяму віной заканамернае пагаршэнне здароўя і занепад сіл. Дрэнная памяць можа стаць прычынай незачыненай дзверцы печы або непатушанай свечкі падчас рэлігійнага свята. Як і зніжэнне вастрыні пачуццяў: пажылы чалавек не зможа лёгка ўлавіць пах дыму ці газу, які выходзіць з-пад фаеркі. Пры зніжэнні слыху — не пачуе ад людзей аб небяспецы, а з-за наяўных праблем апорна-рухальнага апарату не здолее самастойна пакінуць небяспечную зону.

Іншыя прычыны — знешнія абставіны: няспраўная электраправодка, праблемы з печчу, зламаныя электрапрыборы і г. д. «На мой век хопіць» — самая частая фраза, якую можна пачуць ад пажылых людзей пры наяўнасці відавочных праблем. На жаль, пенсіянеры не заўсёды могуць выправіць іх самастойна, а прасіць сваіх дзяцей ліквідаваць непаладку не лічаць неабходным. «Дык сын мой працуе. У яго сваіх спраў хапае», — так апраўдала абыякавасць сына бабулька, у печы якой за многія гады ўтварылася вялікая расколіна. Як аказалася, сын не прыязджаў да маці больш за год, апраўдваючыся тым, што яго праблемы патрабуюць знаходзіцца ў межах горада. Такія сітуацыі прымушаюць задумацца пра тую прорву, што ўтвараецца паміж бацькамі і дзецьмі пасля набыцця тымі самастойнасці, калі здароўе і жыццё самага роднага сэрцу чалавека адыходзяць на другі план. Каб прадухіліць непапраўнае, варта ўсяго толькі адказаць на пытанне: што можна зрабіць дзеля бяспекі састарэлых бацькоў?

А зрабіць можна многае. І лета выдатна падыходзіць для гэтага. **У першую чаргу, калі ў вас прыватнае домаўладанне, візуальна агледзьце печ і комін.** Яны не павінны мець расколін і бачных пашкоджанняў. Пры наяўнасці апошніх абавязкова зашпатлюйце іх. Прыбіце на падлозе каля топачных дзверцаў металічны ліст памерам 50х70 см у тым выпадку, калі яго няма. Абавязкова ачысціце комін ад сажы: гэта ўзмоцніць цягу і прадухіліць узгаранне. І нагадайце яшчэ раз бацькам, што **катэгарычна забараняецца распальваць печы лёгкаўзгаральнымі вадкасцямі**, а таксама сушыць рэчы і дровы каля адкрытага агню.

Трэба выдзеліць час і на электраправодку: пагледзець, ці няма там участкаў з парушанай ізаляцыяй. Калі не можаце замяніць праблемныя зоны, скарыстайцеся ізастужкай. **Запомніце: праводку нельга заклейваць шпалерамі, а дрот злучаць пры дапамозе скручвання** — ужывайце гаечна-балтовыя злучэнні або пайку. Адрамантуйце або замяніце няспраўныя электрапрыборы, а на кухні расстаўце рэчы так, каб яны не змаглі выклікаць загаранне.

Дапамажыце бацькам у навядзенні парадку на прысядзібным участку, пры гэтым не забывайце аб правілах пажарнай бяспекі. **Ніколі не спальвайце смецце і сухую траву ў непрыстасаваных для гэтага месцах** — дастаткова невялікага паveву ветру, каб агонь хутка распаўсюдзіўся, ахапіўшы жылыя пабудовы. Лепш вывезці ўсё на сметнік, а ў самым крайнім выпадку, калі такой магчымасці няма, зрабіць бяспечным месца для спальвання. (Для гэтага падыходзіць металічная бочка, вакол якой трэба абкапаць зямлю не менш чым 30-сантыметровай паласой.) І — што самае важнае — заўсёды трымайце паблізу вядро з вадой або вогнетушыцель.



Стварыце ўсе ўмовы для таго, каб у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі ў пажылых людзей была магчымасць выклікаць на дапамогу ратавальнікаў. Занясіце нумары экстранных службаў у тэлефон, напішыце на паперы неабходныя звесткі (адрас, імя і прозвішча) і пакладзіце іх у бачных месцах, каб бацькі не разгубіліся і не забыліся падчас званка дыспетчару МНС. Пастаўце аўтаномны пажарны апавяшчальнік у кожным жылым пакоі — сваім гукам ён разбудзіць нават спячага чалавека і апавясціць пра бяду. Усё гэта — неабходны мінімум, які дазволіць зберагчы родных людзей.

**Ганна ШЛОМА, інспектар Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС.**

# СВЯТА КОЖНЫ ДЗЕНЬ,

## альбо Мая мама — аніматар!

**Алеся Гайдук у родных Баранавічах — асоба досыць вядомая: не толькі таму, што некалькі гадоў узначальвала сектар па рабоце з дзецьмі ў гарадскім палацы культуры, але яшчэ і таму, што ў яе ўлюбёная дзецьмі розных узростаў прафесія. Алеся — аніматар, арганізатар і вядучая свят (у гэтым амплуа яна «Алеся Клаўнеса»), а таксама вядучая дзіцячай праграмы «Казкі на ноч» на мясцовым тэлеканале «Інтэкс». Дадайце да партрэта яркую і смелую прычоску — і стане зразумела, чаму побач са сваёй дачкой Надзеяй Алеся выглядае хутчэй старэйшай сяброўкай, чым маці.**





— Усё люблю рабіць разам з мамай — гуляць, катацца на роліках і веласіпедзе, здымаць відэа, — крыху сарамліва прызнаецца 7-гадовая Надзя — у такой самай сукенцы і з такімі ж каляровымі коскамі, як у Алесі.

***— Тады раскажы і нам пра яе. Ці ведаеш, як яна стала аніматарам?***

**Надзя:** Папраўдзе кажучы, не ведаю...

**Алеся:** Напэўна, Надзя ўжо нарадзілася ў сям'і, дзе ўсе былі аніматарамі, — і я, і мая сястра Даша, і яе муж Дзяніс скончылі тэатральнае аддзяленне (паводле дыплома Гродзенскага каледжа мастацтваў, Алеся — арганізатар культурнадасугавай дзейнасці, рэжысёр народных абрадаў і свят. — **«СГ».**) і працавалі на святах для дзяцей і дарослых. Я ў дэкрэце нават і паўгода не прабыла, таму Надзя з маленства бачыла, што мама ўнутры свят, для яе мама — Снягурка і тата — Дзед Мароз — гэта такія будзённыя, звыклыя рэчы. У нас нават ёсць фота практычна адразу пасля радзільні, дзе я ў касцюме клоўна трымаю дачушку на руках, дый потым яна ў калясцы ездзіла з намі на ўсе рэпетыцыі і выступленні.

...Некалькі гадоў таму Алеся разам з сястрой Дар'яй прыдумала ідэю тэлепраграмы «Дзеткі-непаседкі», якую яны праз сяброў прапанавалі баранавіцкаму тэлеканалу «Інтэкс» — і, адразу атрымаўшы «дабро», літаральна назаўтра знялі першы выпуск. Потым змяняліся аператары, сышоў адзін з вядучых — і Алеся стала вядучай у іншай праграме, «Казкі на ноч», дзе чытае дзецям казачныя гісторыі. «Муж, хоць ён і працуе аператарам, адразу сказаў: «Мая камера гэта не здымае» — таму некаторыя відэасюжэты мне здымае сястра ці нават Надзя, але не наш тата», — смяецца суразмоўца.

***— Надзя, табе мама больш падабаецца ў вобразе, калі яна ва ўсякіх забаўных касцюмах — Поні, Фіксік, Аднарог — ці калі яна проста мама?***

**Н.:** Калі проста мама. Я нават па тэлевізары яе праграму не гляджу, казкі дома чытаем. Мульцяшныя героі для маленькіх мне таксама ўжо нецікавыя, я ведаеце каго люблю — Хлебакачак з мультканала Nickelodeon! А які ўбор з мамінага рабочага гардэробу найбольш падабаецца? Ну-у... Не ведаю, як ён называецца — з TikTok, такі аранжавы, яркі, з маскамі і кепкамі.

**А.:** Гэтыя «супрацьвірусныя» касцюмы пашыла наша бабуля, мая мама. Даўно прыдумалі іх, але ў сувязі з напружанай сітуацыяй і мы баяліся, і самі нашы кліенты засцерагаліся замаўляць аніматараў, цяпер неяк усе ачунялі. Канешне, працаваць у такіх шчытках і масках няпроста, але затое выглядае сучасна, ярка і цікава — не так, як ва ўсіх.

Зрэшты, згадвае Алеся, дачка пазнае яе ў любым уборы: «Аднойчы мяне папрасілі тэрмінова правесці свята ў дзіцячым садку — патэлефанавалі літаральна за паўгадзіны да пачатку. Трохгадовую дачку не было з кім пакінуць, дамовіліся, што вазьму з сабой і пасаджу ў групе. І вось я ў касцюме Кіці працую з маленькімі, двух-трохгадовымі дзеткамі, усё ідзе добра, ніхто не плача, малым падабаюцца мыльныя бурбалкі, усім весела... І тут раптам чую гучны Надзін шэпт: «Ведаеце што? Гэта не Кіці, гэта мая мама! Ма-ма, чуеш, ма-а-ма!» Потым я пыталася: «Надзя, навошта ты гэта казала?» — а дачка выдае: «Бо падманваць — непрыгожа». І цяпер гэтая праўдзівасць і шчырасць у яе захаваліся, так што ніякіх дзявочых сакрэтаў захаваць ад таты ў нас не атрымліваецца».

Слова за слова, і Надзя расказвае, што яна без пяці хвілін другакласніца і далёка не навічок на сцэне. Па-першае, клас — з харэаграфічным ухілам, а па-другое, дзяўчынка яшчэ да паступлення ў звычайную школу наведвала заняткі ў тэатральнай студыі, якія вядзе яе родная цётка Дар'я Шыманец, так што можа і верш прачытаць як мае быць, выразна, і спяваць, і танцаваць. Напаўжартам цікавімся: «Напэўна, рыхтуешся пайсці ў маміну каманду аніматарам?»

**Н.:** Ой, не! Калі б я штосьці і рабіла ў арганізацыі свят, то здымала б мерапрыемствы на відэа.

**А.:** Я неаднойчы прапаноўвала Надзі паўдзельнічаць у святах, але пакуль такога жадання ў яе няма. Паколькі яна па характары гэтакі крэмень, які не будзе саступаць і ў якога «не» значыць «не», то прымушаць яе зрабіць штосьці супраць жадання бессэнсоўна, дый не трэба. Калі дачка была маленькая, то любіла выступаць на ранішніках — і Снягуркай была, і Эльзай з «Халоднага сэрца», ды й цяпер лёгка можа выступіць, аднак катэгарычна не любіць рэпеціраваць і выслухоўваць заўвагі рэжысёра. А вось тэлевядучай дачка стаць не супраць: вясной мы прыдумалі «каранцінныя» сюжэты для дзяцей, якія з бацькамі знаходзяцца ў самаізаляцыі, — вясёлую размінку з казачнымі персанажамі, відэавіншаванні з днём нараджэння, — і Надзя запісвала некаторыя сюжэты.

***— Што ў прафесіі аніматара самае складанае?***

**Н.:** Проста выступаць на сцэне — гэта адно, гэта не страшна і нескладана.



А вось калі вакол многа людзей і ад цябе залежыць, якое будзе іх свята, а ты не ўпэўнены, ці ўсё атрымаецца...

**А.:** Напэўна, самае складанае — знайсці кантакт з людзьмі, будзе гэта публіка ў вялікай канцэртнай зале ці госці на дзіцячым дні нараджэння. Як бы там ні было, сустракаюць па адзежцы, і трэба спадабацца людзям, каб яны разняволіліся і зацікавіліся, — тады цябе пачынаюць слухаць. Часта задавала сама сабе пытанне, з кім цяжэй працаваць — з дзецьмі або дарослымі, — і адназначнага адказу дагэтуль даць не магу. Напрыклад, з дзецьмі адразу бачыш, падабаецца ім тое, што ты робіш, альбо не, які ў іх настрой, як цябе ўспрымаюць. Калі гаворка пра вяселле ці юбілей, дзе збольшага дарослыя, іх прасцей угаварыць на нейкія рэчы. Асобная гаворка — выпускнікі школ, яшчэ не зусім дарослыя, але ўжо не дзеці, з якімі трэба быць і сяброўкай, і арганізатарам, што адказвае за правядзенне свята. Але мне пашанцавала ў тым сэнсе, што ўся наша сям'я — творчая: і муж, які працуе аператарам, і мая сястра з мужам, і наша мама, якая сама шые многія касцюмы... Таму не бывае свят, якія раблю я адна, мы ўсе разам, мы — каманда і падтрымліваем адно аднаго.

***— Тады што для вядучага самае прыемнае?***

**Н.:** Не ведаю... Калі свята скончылася, усе гледачы задаволеныя і пляскаюць у далоні. Або калі ставяць «лайкі» пад тваім відэа.

**А.:** Па вялікім рахунку, так і ёсць, самае галоўнае — апладысменты і задаволеныя гледачы незалежна ад узроўню і маштабу свята. Мне здаецца, хто хоць аднойчы адчуў удзячнасць публікі, гэту зваротную сувязь, той ужо не зможа развітацца са сцэнай, бо гэта неверагоднае эмацыянальнае сілкаванне. Узяць мяне: хоць паўгода, як я сышла з гарадскога палаца культуры ў самастойнае плаванне, але некаторыя кірункі не пакідаю дагэтуль — напрыклад, творчыя і дабрачынныя праекты для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, да якіх заўжды прыязджаю з радасцю.

***— Якое свята на працягу года для вас самае любімае?***

**Н.:** Дзень нараджэння. Чаму? Таму што атрымліваеш мноства падарункаў і віншаванняў. У мяне, дарэчы, дзень нараджэння 6 кастрычніка, а ў мамы — 7-га.

**А.:** Напэўна, Новы год. Як бы ні было шмат работы і стомленасці, усё адно гэта неверагоднае адчуванне казкі, і нават калі ты ўжо дарослы і сам працуеш на навагодніх святах і карпаратывах да раніцы (а я працую ў Новы год, мабыць, гадоў з 17), хочацца крышачку верыць у Дзеда Мароза. Мы з Надзяй пішам лісты сапраўднаму Дзеду Марозу, чакаем яго прыходу, а 1 студзеня абавязкова шукаем падарункі пад ёлкай. Сёлета, напрыклад, Дзед Мароз за добрыя паводзіны прынёс тэлефон, і цяпер бацькам трэба кантраляваць час баўлення з ім.

***— Калі сказаць пра вядучага свят трыма словамі, аніматар — якая гэта прафесія?***

**Н.:** Прыгожая... А яшчэ добрая і харошая. Як мама.

**А.:** Як апісаць сваю работу? Шчырая, на мой погляд, высакародная і, канешне, любімая. Мне ў ёй усё падабаецца, нават калі здараюцца нейкія неспадзяванкі ці экстрэмальныя акалічнасці і трэба перарабляць сцэнарый па ходзе. У свой час я падпрацоўвала і ў краме, і складаннем букетаў займалася, і як быццам падабалася, але — не тое, няма такіх сапраўдных, непадробных эмоцый. Магчыма, будзе змяняцца фармат правядзення свят, з'явяцца новыя тэхналогіі, але застануцца жывыя стасункі з людзьмі — вось у чым сутнасць.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**
**і з архіва гераіні.**

*Баранавічы — Мінск.*



Месяц-два таму, кажа Алеся, былі запатрабаваныя «бескантактавыя святы» з роставымі лялькамі. Цяпер усе больш распранутыя, і дзеці зноў чакаюць у госці ўлюбёных персанажаў: дзяўчаты — лялек LOL, поні і аднарогаў, хлопчыкі — «Шчанюковы патруль» і герояў «Майнкрафт».



## ЗАО «Белреализация» извещает о проведении электронных торгов ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297), 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего в деле о банкротстве Мясоедова Руслана Федоровича.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **14 июля 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % (снижение на 10 %) | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % (снижение на 25 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | Лот № 1. Полуприцеп МАЗ 93801, бортовой 1991 года выпуска, кузов (рама) шасси – 064, регистрационный номер 3930 ТМ, инв. № 8375 | 2484,00 | 2070,00 |
| 2 | Лот № 2. Полуприцеп МАЗ 9380, бортовой 1990 года выпуска, кузов (рама) № XTM938000L00000119, регистрационный номер 4894 АА-6, инв. № 8427 | 2376,00 | 1980,00 |
| 3 | Лот № 3. Автомобиль грузовой, специальный, цистерна ZIL-433362, 197 года выпуска, кузов (рама) 3433441, регистрационный номер ТМ 2467, инв. № 8508 | 7884,00 | 6570,00 |
| 4 | Лот № 4. Прицеп тракторный 2 ПТС-4, год выпуска не установлен, заводской номер б/н, регистрационный номер 5948 БЮ, инв. № 8365 | 2268,00 | 1890,00 |
| 5 | Лот № 5. Прицеп ЧМЗАП 938, год выпуска не установлен, заводской номер б/н, регистрационный номер 5799 МЕ, инв. № 8434 | 9828,00 | 8190,00 |
| 6 | Лот № 6. Экскаватор ЭО-3322И, год выпуска не установлен, заводской номер не установлен, не зарегистрирован, инв. № 8362 | 8856,00 | 7380,00 |
| 7 | Лот № 7. Фронтальный погрузчик ТО-18, 1988 года выпуска, заводской № 923996, регистрационный знак 5218 МЖ, инв. № 8309 | 15336,00 | 12780,00 |
| 8 | Лот № 8. Экскаватор одноковшовый ЭО -2621, год выпуска не установлен, заводской номер не установлен, инв. № 8361 | 4860,00 | 4050,00 |
| 9 | Лот № 9. Полуприцеп МАЗ 9758, бортовой тентовый, 1999 года выпуска, кузов (рама) № Y3M975800X0001278, регистрационный номер 3711 ТА, инв. № 8516 | 5508,00 | 4590,00 |
| 10 | Лот № 10. Автомобиль грузовой, специальная-пожарная, ЗИЛ 131, 1988 года выпуска, кузов (рама) 779653, регистрационный номер ТА2848, инв. № 8392 | 6696,00 | 5580,00 |
| 11 | Лот № 11. Автомобиль грузовой, специальная-пожарная, ЗИЛ 130, 1985 года выпуска, кузов (рама) 2346484, регистрационный номер ТА 2847, инв. № 8362 | 6480,00 | 5400,00 |
| 12 | Лот № 12. Станок радиально-сверлильный 2 Е52, инв. № 2031 | 2484,00 | 2070,00 |
| 13 | Лот № 13. Круглошлифовальный станок, инв. № 6025 | 6264,00 | 5220,00 |
| 14 | Лот № 14. Станок фрезерный 6Р83, инв. № 6029 | 2700,00 | 2250,00 |
| 15 | Лот № 15. Станок плоскошлифовальный, инв. № 6031 | 8100,00 | 6750,00 |
| 16 | Лот № 16. Станок плоскошлифовальный, инв. № 6032 | 3780,00 | 3150,00 |
| 17 | Лот № 17. Станок трубогибочный, инв. № 6038 | 1188,00 | 990,00 |
| 18 | Лот № 18. Станок торцовочный (ленточная пила), инв. № 9514 | 1728,00 | 1440,00 |
| 19 | Лот № 19. Станок строгальный четырехсторонний, инв. № 9536 | 3780,00 | 3150,00 |
| 20 | Лот № 20. Координатно-расточной станок КР-450, инв. № 9537 | 2700,00 | 2250,00 |
| 21 | Лот № 21. Четырехсторонний станок С26-2Н, инв. № 9669 | 2916,00 | 2430,00 |
| 22 | Лот № 22. Поперечно-строгальный станок, инв. № 28807 | 4104,00 | 3420,00 |
| 23 | Лот № 23. Станок фрезерный 6р82г, инв. 28809 | 4320,00 | 3600,00 |
| 24 | Лот № 24. Станок фрезерный ОФ-55, инв. № 28813 | 7020,00 | 5850,00 |
| 25 | Лот № 25. Бензиновый снегоуборочник GST 110EL VT (5595840) | 2052,00 | 1710,00 |
| **Местонахождение – Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, подробная информация на BELTORGI.BY** | | | |

Для участия в торгах необходимо в срок **по 13 июля 2020 г. 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее пяти рабочих дней со дня завершения электронных торгов.

## ЗАО «Белреализация» извещает о проведении электронных торгов ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297), 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего в деле о банкротстве Мясоедова Руслана Федоровича.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу №15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области будут проведены **14 июля 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль легковой «Фольксваген Транспортер», 2003 г. в., рег. знак 6677 TI | 15 240,00 | 13 716,00 |
| 2 | Полуприцеп МАЗ 93801, бортовой 1991 г. в., рег. знак 3930 ТМ | 2 760,00 | 2 484,00 |
| 3 | Полуприцеп МАЗ 9380, бортовой 1990 г.в, рег. знак 4894 АА-6 | 2 640,00 | 2 376,00 |
| 4 | Автомобиль грузовой, специальный, цистерна ZIL-433362, 1997 г. в., рег. знак ТМ 2467 | 8 760,00 | 7 884,00 |
| 5 | Трактор МТЗ 82, 1997 г. в., рег. знак 1144 ТА | 10 920,00 | 9 828,00 |
| 6 | Прицеп тракторный 2 ПТС-4, г. в. н/у, рег. знак 5948 БЮ | 2520,00 | 2 268,00 |
| 7 | Прицеп ЧМЗАП 938, г. в., н/у, рег. знак 5799 МЕ | 10 920,00 | 9 828,00 |
| 8 | Экскаватор ЭО-3322И, г. в., н/у, рег. знак | 9 840,00 | 8 856,00 |
| 9 | Фронтальный погрузчик ТО-18, 1988 г. в., рег. знак 5218 МЖ | 17 040,00 | 15 336,00 |
| 10 | Экскаватор одноковшовый ЭО -2621, г. в., н/у | 5 400,00 | 4 860,00 |
| 11 | Полуприцеп МАЗ 9758, бортовой тентовый, 1999 г. в., рег. знак 3711 ТА | 6 120,00 | 5 508,00 |
| 12 | Автомобиль грузовой, специальная-пожарная, ЗИЛ 131, 1988 г. в., рег. знак ТА2878 | 7 440,00 | 6 696,00 |
| 13 | Автомобиль грузовой, специальная-пожарная, ЗИЛ 130, 1985 г. в., рег. знак ТА 2847 | 7 200,00 | 6 480,00 |
| 14 | Станок радиально-сверлильный 2 Е52, инв. № 2031 | 2 760,00 | 2 484,00 |
| 15 | Круглошлифовальный станок, инв. № 6025 | 6 960,00 | 6 264,00 |
| 16 | Станок фрезерный 6Р83, инв. № 6029 | 3 000,00 | 2 700,00 |
| 17 | Станок плоскошлифовальный, инв. № 6031 | 9 000,00 | 8 100,00 |
| 18 | Станок плоскошлифовальный, инв. № 6032 | 4 200,00 | 3 780,00 |
| 19 | Станок трубогибочный, инв. № 6038 | 1 320,00 | 1 188,00 |
| 20 | Станок торцовочный (ленточная пила), инв. № 9514 | 1 920,00 | 1 728,00 |
| 21 | Станок строгальный четырехсторонний, инв. № 9536 | 4 200,00 | 3 780,00 |
| 22 | Координатно-расточной станок КР-450, инв. № 9537 | 3 000,00 | 2 700,00 |
| 23 | Четырехсторонний станок С26-2Н, инв. 9669 | 3 240,00 | 2 916,00 |
| 24 | Поперечно-строгальный станок, инв. № 28807 | 4 560,00 | 4 104,00 |
